СУБОТА, 16 ВЕРАСНЯ 1933 г. № 214

ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАЕЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ.

ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б, ГАРСОВЕТА І ГАРПРАФСОВЕТА.

Адрас рэдакцыі і канторы: г. Віцебск, плац Вохі, Палац працы, трэці паверх.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА 2 р. у мес.
Цана асобн. нумару 8 кап.

Тэлефоны рэдакцыі: Сакратарыят—1-73; нач. рэдактара, нарсыйны і мясавы сектары—4-76; сектары прамысловасці, сельска гаспадарчы—72; рабоч. снабжэння і кааперацыі, сов. будаўніцтва, нац.-культурнага будаўніцтва—6-15; Аістоў рабочых і калгаснікаў, бюро расследавання — 2-00; наборна -55; начная рэдакцыя—4-56.

СЕННЯ У НУМАРЫ:

Аб плане снабжэння бульбай гарадоў і асноўных прадпрыемстваў БССР на 1933—34 год. Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Калгасы „Чырвоная армія", «Молат», «Новы свет» і Замастоцкага сельсовета завяршылі сяўбу азімых.

ЗА ГРАНІЦАЙ: Міжнародны грамадскі суд над сапраўднымі падпальшчыкамі рэйхстага.

АБ ПЛЯНЕ СНАБЖЭННЯ БУЛЬБАЙ ГАРАДОЎ І АСНОЎНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БССР НА 1933-1934 ГОД.

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

1. Пашырэнне пасеўных плошчаў пад бульбай у прыгарадных гаспадарках, лепшая апрацоўка глебы, што забяспечвае большую ўраджайнасць і большы выхад таварнай прадукцыі прыгарадных гаспадарак у параўнанні з мінулым годам, значна павялічаны водпуск бульбы з цэнтралізаванага фонду, а таксама большыя магчымасці па разгортванні дэцэнтралізаваных загатовак ствараюць умовы для лепшага снабжэння бульбай рабочых і служачых асноўных гарадоў і прадпрыемстваў БССР як па грамадскаму харчаванню і індывідуальному снабжэнню, так і па лініі закрытых устаноў (больніцы, дзіцячыя дамы і сады, дамы адпачынку).

2. Устанавіць на 1933 34 г. наступныя нормы снабжэння бульбай:

а) для грамадскага харчавання на кожнага харчуючагася—120 кгр. на год, на торфпрамысловасці—150 кгр., для дамоў адпачынка і санаторыяў—130 кгр, для закрытых устаноў—75 кгр, для дзіцячых дамоў, дзіцячых садоў, ясляй, школьных сняданняў—60 кгр;

б) для індывідуальнага снабжэння: 1 спіс першай катэгорыі—130 кгр., 1 спіс II кат.—80 кгр., II спіс I кат.—110 кгр, II спіс II катэгорыі—60 кгр., III спіс I кат.—80 кгр., III спіс II катэгорыі—40 кгр.

3. Выходзячы з гэтых норм і кантынгентаў снабжаемых асноўных гарадоў і прадпрыемстваў БССР, устанавіць агульны план патрэбнасці бульбы па БССР—119.893 тоны, у тым ліку:

а) грамадскае харчаванне рабочых і служачых прадпрыемстваў і устаноў (уключаючы школьныя снеданкі)—28 878 т.;

б) індывідуальнае снабжэнне па гарадох—36 880 т.;

в) закрытыя ўстановы па гарадах (больніцы, дзіцячыя дамы, сады, дамы адпачынка)—3.449 т;

г) па рэспубліканскіх арганізацыях (чыгунка, воднікі, тарфянікі, лесасекцыя, дорбудаўніцтва і спецпрызначэнне) на грамадскае харчаванне і індывідуальнае снабжэнне—50,686 т.

4. Устанавіць пакрыццё патрэбнасці бульбы з наступных крыніц:

а) таварнай прадукцыі бульбы прыгарадных гаспадарак (ЦРК, ЗРК, ОРС'аў і інш. арганізацый) 52.526

б) цэнтралізаванага фонда снабжэння 41.000

в) самазагатоўкі 32.685

5. У адпаведнасці з гэтым устанавіць наступны план патрэбнасці бульбы і пакрыццё плана па гарадах і арганізацыях:

а) Па гарадах:

ГОРАД	Патрэбнасць	Пакрыццё: Ад прыг. гаспадаркі	З цэнтр. плану	Дэц. загатоўкі
Менск	21.532	5.587	12 183	4 425
Віцебск	13.309	4.420	5 035	3.880
Гомель	11.397	5.972	3 601	2.695
Магілёў	5.896	2.130	1 828	2 860
Бабруйск	4.286	1.530	1.389	2.110
Орша	2.105	900	500	1.100
Барысаў	3.177	2.021	562	1.350
Полацак	1 841	550	464	1.150
Рэчыца	1.932	1.550	311	750
Мазыр	1.402	600	244	850
	66.877	25.260	26.117	21.170

в) Па рэспубліканскіх установах:

Назва снабж. арганіз.	Патрэбнасць	Пакрыццё: Ад прыг. гаспадаркі	З цэнт. фонд.	Дэцзагатоўкі
Спец. прызначэнні	21.030	13.225	6 050	3.350
ОРС'ы чыгункі	18 011	7.068	5.500	5.500
Воднікі	1.000	—	500	500
Торф	2 117	1.224	600	600
Лес	6.308	6.400	500	—
Дарбудаўніцтва	2 220	395	1.000	850
	50.686	28.312	14.150	10.800

в) Па іншых прадпрыемствах БССР.

	2.330	2.135	880	375
УСЯГО . . .	118 893	55.707	40.597	32.845

6. Дазволіць ЗРК прадпрыемстваў г. Менска: «Комунар», імя Варашылава, «Большэвік». «Кастрычнік», імя Молатава, імя Кагановіча; г. Віцебска: акулярнай, «Чырвоны металіст», шчоткамбінат; г. Гомеля: «Комінтэрн», «Праца», «Пролетарый»; г. Магілёва: імя Сталіна; Барысава: імя Домбаля; Рэчыцы: «Днепр» за лік выхаду таварнай бульбы прыгарадных гаспадарак павялічыць норму для індывідуальнага снабжэння: для снабжаемых па 1-му спісу да 150—160 кгр.; па II му спісу да 130 кгр. на асноўнага рабочага.

7. Улічваючы, што практыка мінулых год па мэханічнаму размеркаванню бульбы пайшчыкам—выдача адразу на рукі ўсёй гадавой нормы спрыяе лятуньству на прадпрыемствах і ні ў якім разе не ўвязваецца з інтарэсамі вытворчасці—лічыць неабходным пабудаваць сыстэму снабжэння бульбай у бягучым годзе шляхам разгортвання продажы яе кааперацыяй і дзяржаўным гандлем на працягу ўсяго года ў межах, устаноўленых для адпаведных кантынгентаў норм, прычым праводзіць гэту сыстэму ў першую чаргу ў тых гарадах і прадпрыемствах, дзе ёсць у наяўнасці адпаведная тэхнічная база (складскія памяшканні, бульбахавальнікі).

Даручыць камісіі ў складзе тт. Карначова, Гераўкера і Цэронка распрацаваць практычныя мерапрыемствы па ажыццяўленні гэтага пункта і свае прапановы ўнесці ў ЦК у дэкадны тэрмін.

8. Даручыць упаўнаважанаму камітэта загатовак па БССР сумесна з БКС і ЦСПСБ у дэкадны тэрмін разглядзець усе пытанні, звязаныя з забеспячэннем выканання ўстаноўленага плана дэцзагатовак і свае канкрэтныя прапановы ўнесці ў ЦК.

9. Прыняць да ведама заявы прадстаўнікоў гарсоветаў і ЗРК аб наступнай наяўнасці ў іх бульбахавальнікаў:

На Менску на	3.796 тон	На Віцебску на	5.477 тон
» Гомелю »	679 »	» Барысаву »	4.000 »
» Магілёву »	1.820 »	» Оршы »	300 »
» Полацку »	550 »	Усяго »	16.622 тоны

Прыняць да ведама заяву БКС (т. Зелічонка), што на плодтрэстах ёсць наступная колькасць бульбахавальнікаў:

На Менску на	5.000 тон
» Гомелю »	1.800 »
» Віцебску »	1.250 »
Усяго на	8.050 тон

Адзначыць, што наяўнасць бульбахавальнікаў ні ў якім разе не здавальняе патрэбы на хаванне бульбы, пры чым асабліва пагражаючае становішча ў Менску, Гомелю і Баруйску.

Абавязаць гарсоветы, гаржыласюзы і жытрэсты гарадоў на працягу дэкаднага тэрміна вывяўіць і поўнасцю перадаць кааперацыйна гандлёвым арганізацыям памяшканні, прыгодныя для хавання бульбы і неадкладна вярнуць кааперацыйным арганізацыям забраныя ў іх хавальнікі гародніны.

10. Улічваючы, што пры разгортванні совецкага гандлю бульбай, на бывае выключнае значэнне арганізацыя хавання гэтай бульбы і разгортванне сеткі крам і склепаў, прыстасаваных для арганізацыі гандля, ЦК КП(б)Б і СНК БССР абавязваюць Белкаапсаюз, Белгандаль, старшынь ЗРК і ЦРК, нач. ОРС'аў і інш. кіраўнікоў кааперацыйна-гандлёвых арганізацый неадкладна правесці падрыхтаванасць наяўных бульбахавальнікаў і гандлёвай сеткі, зрабіць у іх неабходны рамонт, скончыць распачатае будаўніцтва, адшукаць дадаткова неабходныя памяшканні, якія могуць быць прыстасаваны для хавання і гандля бульбай з такім разлікам, каб да 15 верасня забяспечыць усю патрэбнасць у бульбахавальніках гандлёвай сеткі.

11. Абавязаць кіраўнікоў усіх арганізацый неадкладна вызначыць адпаведныя месцы для буртавання, падрыхтаваць неабходную колькасць саломы і інш. матар'ялаў, падрыхтаваць спецыялістаў для буртавання з тым, каб не дапускаць псавання і раскрадвання захаванай у буртах і бульбахавальніках бульбы.

Папярэдзіць усіх старшынь гарсоветаў, дырэктароў прадпрыемстваў, старшынь ЗРК і дырэктароў каапгасаў, загадчыкаў сталовых і кіраўнікоў кааперацыйна гандлёвых арганізацый, што за дрэнную арганізацыю хавання і гандля бульбай, за дапушчэнне псавання і раскрадвання яе—будуць прыцягвацца да суровай партыйнай і адміністрацыйнай адказнасці. Даручыць ЦКК—РСІ устанавіць пастаянны нагляд як за выдаткаваннем, так і за захаваннем бульбы.

12. Абавязаць НКСнаб—т. Карначова з удзелам БКС і ЦСПСБ у дэкадны тэрмін распрацаваць сярэднія адзіныя цэны (адпускныя) на усю бульбу, якая ідзе на снабжэнне кантынгентаў, устаноўленых данай пастановай і прадставіць на зацверджанне ўпаўкамфондаў.

13. Абавязаць дырэктароў прыгарадных гаспадарак поўнасцю забяспечыць належнае захаванне пакінутага ў прыгарадных гаспадарках насеннага фонда ранняй і позняй бульбы і папярэдзіць іх, што як за захаванне насеннай бульбы і таварных лішкаў, так і за рацыянальнае скарыстанне кармавых фондаў, яны нясуць персанальную адказнасць і што ў выпадку папсавання яе або рэбазарвання яны будуць прыцягвацца да судовай адказнасці.

14. Даручыць гаррайкомам КП(б)Б і гарсоветам распрацаваць рад канкрэтных апэрацыйных мер, выцякаючых з данай пастановы ЦК і СНК, маючы на ўвазе, што канкрэтная рэалізацыя гэтай пастановы мае выключнае значэнне як адно з важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўрада ў галіне паляпшэння рабочага снабжэння.

15. Зацвердзіць матар'ялы і ўсе іншыя прапановы, распрацаваныя камісіяй т. Рыскіна па пытаннях арганізацыі снабжэння гарадоў і асноўных прадпрыемстваў БССР бульбай.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Вышэй тэмпы уборкі, абмалота і збожжапаставак!

Па прыкладу калгасаў „Чырвоная армія", „Молат", „Новы свет" і Замастоцкага сельсовета разгарнуць сяўбу азімых, асабліва пшаніцы, звыш плана.

ШЫРОКА РАСТЛУМАЧЫМ КАЛГАСНІКАМ І ПРАЦОЎНЫМ АДНААСОБНІКАМ, ШТО З ПЛОШЧЫ, ЗАСЕЯНАЙ ЗВЫШ ПЛАНА, ЗБОЖЖАПАСТАЎКІ НЕ ВЫТВАРАЮЦЦА.

Спаборніцтва сельсоветаў.

(ПА ДАНЫХ НА 10 ВЕРАСНЯ).

	Замастоцкі.	Машканскі.
Зжата збожжавых	76,2 проц.	73 проц.
Звезена	58,3 „	78,2 „
Абмалочана	30,5 „	28,4 „
Збожжапастаўкі: калгасы	36,5 „	48,6 „
аднаасобн.	17,3 „	20,7 „
Засеяна азімых	62,2 „	57,1 „

	Селюцкі.	Рудніцкі.
Зжата збожжавых	49 проц.	82 проц.
Звезена	66,1 „	26 „
Абмалочана	17,1 „	14,7 „
Збожжапастаўкі: калгасы	51,7 „	27,2 „
аднаасобн.	26,4 „	19,1 „
Засеяна азімых	46,8 „	46,2 „

ПЕРАДАВІКІ ЗМАГАЮЦЦА ЗА ЗВЫШПЛАНАВАЕ ПАШЫРЭННЕ АЗІМАГА КЛІНУ.

Перадавыя калгасы Віцебскага раёну, з поспехам выканаўшы планы азімай сяўбы зараз разгортваюць звышпланавую сяўбу.

Калгас «Пяцігодка за чатыры гады» (Шумнянскі сельсавет) засеяў ½ га азіміны звыш плана. Сяўба працягваецца. У калгаснікаў ёсць вялікая зацікаўленасць пасеяць яшчэ звыш плана пшаніцу.

Калгас „Новы свет" гэтага-ж сельсовету, пасеяў звыш плана 0,5 га пшаніцы.

Завяршыўшы сяўбу, калгас «Чырвоная армія» (Віцебскі сельсавет) 13 верасня даў сустрэчны, засеяўшы звыш плана 1 га жыта.

Адзін з перадавых калгасаў раёну і Вялікa-Лётчанскага сельсовету «Молат» засеяў звыш плана 1,5 га пшаніцы.

Гэты рух перадавых калгасаў раёну за пашырэнне азімога кліну і асабліва пшаніцы трэба перанесці на ўсе калгасы раёну, на ўсе аднаасобныя гаспадаркі.

Калгаснікі, захопленыя энтузіязмам барацьбы за высокі ўраджай будучага году, за заможнае жыццё, добра ведаюць пастановы партыі і ўраду аб тым, што ўсякія пасевы звыш плана цалкам вызваляюцца ад збожжапаставак. Яны добра ведаюць, што тое, што яны пасеюць звыш плану застанецца ў іх уласным карыстанні, зробіць новы магутны крок у справе далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, у справе ператварэння іх у заможных.

Р.

Калгасы Замасточча выканалі план сяўбы пшаніцы.

Калгасы Замастоцкага сельсавета 15 верасня скончылі сяўбу азімай пшаніцы, засеяна 225 га, завяршаючы ўборку, калгасы пераключыліся на сяўбу пшаніцы звыш плана.

Старшыня сельсавета Волатаў.
Упаўнаважаны ГК КП(б)Б і гарсовета Эстрын.

Калгасы Міхалёўскага сельсавета завяршылі азімую сяўбу.

Усе калгасы Міхалёўскага сельсавета завяршылі азімую сяўбу. Ёсць магчымасць сеяць звыш плана. Зараз сельсавет займаецца гэтым пытаннем.

ШАПКОЎСКІ.

Калгас імя Чырвонай арміі засеяў звыш плана 1 га жыта.

Скончылі планавую сяўбу па Віцебскім сельсавеце калгасы імя Чырвонай арміі (старшыня Грышчанка), „Наер лэбн" (старшыня Фрэйдзон), „Шлях да соцыялізма" (старшыня Кавалёў).

Калгаснікі „Чырвонай арміі" рашылі сеяць звыш плана. На 14 верасня ўжо засеяна 1 га жыта.

Распачаў сяўбу звыш плана калгас «Шлях да соцыялізма».

БУТКЕВІЧ.

Сеюць звыш плана пшаніцу.

Калгас «ПЯЦІГОДКА ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ», Шумнянскага сельсовета (старшыня Сарокін), цалкам выканаў план азімай сяўбы.

Калгаснікі пастанавілі засяваць звыш плана. Ужо пасеяна палавіна га. Сяўба працягваецца.

У калгаснікаў маецца вялікая зацікаўленасць сеяць звыш плана пшаніцу. Праўленне калгаса прымае меры да наёмцы пшаніцы.

Калгас „НОВЫ СВЕТ" (старшыня Драгаценны) засеяў звыш плана 0,5 га пшаніцы.

Засяваюць звыш плана і ў калгасе імя МОЛАТАВА.

АРЛОЎСКІ.

Сеюць жыта дадаткова.

Калгас „Шлях Ільіча", Даўжанскага сельсавета, завяршыў план азімай сяўбы. Калгаснікі 14 верасня прыступілі да засева жыта звыш плана.

ПІСКУНОЎ.

Перавыканалі план азімай сяўбы.

Калгас „Шчамілаўка", Замастоцкага сельсавета (старшыня Балткоў В.), 13 верасня засеяў звыш плана 0,4 га жыта і 0,65 га пшаніцы.

К.

ДЗЁННІК АГІТПАВОЗКІ Ў КАЛГАСЕ ІМЯ КАЛІНІНА, МАШКАНСКАГА СЕЛЬСОВЕТА.

11—13 верасня.

◆ Асенняя сяўба па калгасе імя КАЛІНІНА зацягваецца. На 11-е верасня калгас засеяў толькі 148 га (план 270).

11 верасня брыгадай агітпавозкі праведзена вытворчая нарада па пытаннях азімай сяўбы і завяршэння ўборкі.

◆ Брыгада зрабіла фотаздымкі лепшых калгаснікаў-ударнікаў, а таксама лодыраў. Лодыры пасля гэтага значна падцягнуліся у рабоце.

◆ Праведзена гутарка з рэдкалегіяй насценгазеты і селькорамі. Выпушчаны два нумары насценгазеты.

◆ Ветурачом павозкі зроблен медагляд жывёлы на калгасным МТФ і даны ўказан і па ліквідацыі недахопаў у догляде жывёлы.

◆ Брыгада дапамагла правесці прыкладнае размеркаванне ўраджая і давяла да ведама кожнага калгасніка, колькі яму прыпадаецца. Гэта значна узняла энтузіязм калгаснікаў.

■ Медурачом зроблен агляд хворых калгаснікаў, якім аказана дапамога і даны медычныя парады.

Уборцы бульбы—ударныя тэмпы!

На 10 верасня па ўсіх сектарах Віцебскага раёна выкапана толькі 131,9 га бульбы (план 6492.1 га), што складае толькі 2 проц. плана. Калгасы выкапалі 54,7 га, аднаасобнікі—43,2 га, каапгасы—33 га і іншыя арганізацыі—1 га.

У Бараўлянскім сельсавеце ні калгасы, ні аднаасобнікі па даных гарЗА да копкі бульбы не прыступілі.

Адсюль відаць, што тэмпы копкі бульбы недапушчальна марудныя.

Рашуча ўзняць тэмпы копкі бульбы, бесперапынна і непасрэдна з палёў грузіць бульбу на здатачныя пункты—галавная задача ўсіх сельсоветаў, ўсіх калгасаў, працоўных аднаасобнікаў раёну.

Прыклад, варты пераймання.

Старасельская школа калгаснай моладзі прымае актыўны ўдзел у барацьбе са стратамі ўраджаю.

10 верасня 355 вучняў выйшла стройнымі калёнамі, арганізавана, на поле калгасаў Старасельскага сельсовета. Прасіліся ісці збіраць калоссі вучні 4 і 3 групы, іх спачатку не прынялі, палічылі «малышамі». Але настойлівыя патрабаванні іх, урэшце, загадчыку ШБМ прышлося задаволіць.

За дзень работы вучні сабралі 300 кг. калоссяў.

Школа прымала ўдзел не толькі ў зборы калоссяў. Яна пашла на дапамогу ў копцы бульбы самаму адстаючаму калгасу сельсовета „НОВАЕ ЖЫЦЦЁ".

Работы выкапалі 6 га ранняй бульбы. Калгас ім за гэта аплаціў натурай. Работы зрабілі вялікую справу—дапамаглі калгасу і зарабілі сабе бульбы на гарачыя снеданні.

Вучні паклалі пачатак масавай копцы бульбы ў калгасе „Новае жыццё".

Асабліва вялікую актыўнасць у арганізацыі копкі бульбы правяла вучаніца 5 групы НАГОРНАЯ, пад кіраўніцтвам якой працавала ўдарная брыгада.

Вось гэты прыклад, які варты пераймання ўсімі школамі Віцебскага раёна.

ПЕСКІН.

Пакончыць з апартуністычным „чаканнем".

11 верасня калгас «1 мая», Віцебскага сельсовета, пачаў возку аўсу з поля. Потым кіраўнікі калгасу разумалі: „Часу хопіць, будзе лепшае надвор'е і авёс яшчэ лепш падсохне" і возку аўсу кінулі, гэтым самым паставіўшы пад пагрозу захаванне ўраджаю.

У калгасе ёсць рад участкаў, дзе магчыма капаць бульбу, але праўленне дагэтуль копкі бульбы не арганізавала. Усё чагосці чакаюць.

Неабходна пакончыць з гэтым апартуністычным «чаканнем». Ударнымі тэмпамі па прыкладу перадавых калгасаў узяцца за канчатковую звозку з поля ўсяго зжатага збожжа, разгарнуць копку бульбы і непасрэдна з поля вазіць яе на здатачныя пункты ў лік бульбапаставак.

У—скі.

Вялікалёгчанцы ўзялі на буксір старасельцаў.

Два сельсоветы—суседзі: Вялікa-лётчанскі і Старасельскі спаборнічаюць па ўсіх відах сельска-гаспадарчых работ.

У спаборніцтве ўвесь час пярэдніцтва бярэ Вялікa-Лётчанскі.

Для дапамогі ў ліквідацыі прарываў адстаючаму Старасельскаму сельсовету Вялікa-лётчанцы 13 верасня накіравалі буксірную брыгаду ў колькасці 14 коняй і 8 калгаснікаў.

У брыгаду вылучаны лепшыя калгаснікі-ўдарнікі, большасць якіх праміяванна за веснавую сяўбу і пасяховую ўборку.

Буксірная брыгада з калгаса «Бяроза» (старшыня Юрчанка) паказвае большэвіцкія ўзоры дапамогі свайму суседу калгасу „Новае жыццё", Старасельскага сельсовета.

Асабліва актыўны ўдзел у арганізацыі буксіра дапамогі прыняў брыгадзір гаркому партыі тав. Парнаў.

13 і 14 верасня буксірная брыгада работала на сяўбе азімых.

ГРЫНМАН.

РАШУЧА ЛІКВІДАВАЦЬ РАЗРЫЎ ПАМІЖ ЦЕРАБЛЕННЕМ, СЛАННЕМ, МОЧКАЙ І АБМАЛОТАМ ІЛЬНУ.

ХОД УБОРКІ І ПЕРШАПАЧАТКОВАЙ АПРАЦОЎКІ ІЛЬНА ПА КАЛГАСНА - СЯЛЯНСКАМУ СЕКТАРУ НА 10 ВЕРАСНЯ 1933 ГОДА.

(У процантах).

Сельсовет	Выцераблена.	Абмалочана.	Выслана і замочана.
Міхалёўскі	89,0	11,4	43,6
Елагінскі	88,8	33,9	33,9
Машканскі	84,2	80,56	55,1
Нікалаўскі	83,3	14,8	50,8
Сялюцкі	80,7	14,9	10,5
Замастоцкі	77,9	20,1	—
Шумнянскі	75,0	54,0	50,0
Бабініцкі	61,1	8,1	27,5
Вялікa-Лётчанскі	59,2	50,41	21,32
Даўжанскі	51,1	—	43,5
Бараўлянскі	50,4	34,3	17,2
Рудакоўскі	49,0	2,4	2,4
Старасельскі	43,1	5,0	4,6
Рудніцкі	38 3	—	40,0
Віцебскі	28,2	—	—
Разам	63,7	23,2	28,6

* * *

Надзвычайна вялікі разрыў паміж цераблеццем, абмалотам, сланнем і мочкай ільна. У Даўжанскім, Рудніцкім і Віцебскім сельсоветах яшчэ не прыступілі да абмалота, а ў Замастоцкім, дзе засеяна 241 га, яшчэ не прыступілі да замочкі, альбо слання.

Неадкладна трэба ў ільнацераблені ўзяць такія тэмпы, каб цалкам выцерабіць увесь лён, рашуча ліквідаваўшы маючыйся разрыў, які з'яўляецца ганебна недапушчальным.

„Хто не робіць, той не есць".

Калгаснікі калгаса імя СТАЛІНА, Машканскага сельсовета, дзякуючы праведзеным праўленнем папярэднім падлікам, ужо ведаюць колькі яны атрымаюць сельгаспрадукцыі за сваю працу ў калгасе.

Вось ШМЕРКІН ЛЁВА—лепшы калгаснік-ударнік, комсамолец, выпрацаваў 237 працадзён; ён атрымае 38 пудоў збожжа, у тым ліку 15 пуд. жыта, 8 пуд. пшаніцы, 15 пуд. розных збожжавых культур і 148 пудоў бульбы. Шмеркін Лёва добрасумленна адносіцца да працы і заўсёды перавыконвае норму выпрацоўкі. За час свайго прабывання ў калгасе ён ніколі такой колькасці збожжа і бульбы не атрымліваў, бо раней быў значна меншы ўраджай і ў гэтым годзе калгас пасеяў больш.

Другі калгаснік-ударнік КАРОТЧАНКА ВАСІЛЬ за 6 месяцаў адзін выпрацаваў 323 працадні. Ён атрымае 51 пуд збожжа, у тым ліку жыта 20 пудоў, пшаніцы 11 пудоў і розных збожжавых 20 пудоў, бульбы 202 пуды.

Процілегласцю гэтым ударнікам а'яўляюцца прагульшчыкі, лодыры, як САСНОЎСКАЯ МАР'Я, якая сістэматычна не выходзіла на работу. Яна думала, што як і ў мінулым годзе ёй усёроўна дадуць збожжа. А зараз калгаснікі над ёю смяюцца і гаворацьць, што «гэтага больш не будзе, партыя сказала—хто не робіць той і не есць». Сасноўская Мар'я за тры дні атрымала толькі 30 кілограм бульбы, 3 кілограмы жыта, 1,5 кілограма пшаніцы і 3 кілограмы розных збожжавых культур.

Калгаснікі ўдарнікі, ведаючы, што за сваю працу яны атрымаюць значную колькасць збожжа, з яшчэ большым энтузіязмам бяруцца за працу. А лодыры сур'ёзна задумваюцца, чэшуць патыліцы і таксама рашаюць, што трэба ўзяцца за працу, а то будуць без хлеба.

Р. ВАСІЛЬНЎ.

ЗА СТАНОВІШЧА СЕЛЬСОВЕТА НЯСЕ ВЯЛІКУЮ АДКАЗНАСЦЬ ШЭФСТВУЮЧАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА.

На 15 м месцы па ходу збожжапаставак, азімай сяўбы і якасці ўборкі стаіць Даўжанскі сельсавет. А лік сельсоветаў на Віцебшчыне як раз 15. Гэтым «пачэсным» месцам сельсавет абавязаны ў значнай ступені свайму шэфу—фабрыцы «Дзвіна». Нельга адрываць становішча работы ў сельсавеце ад становішча шэфскай работы прадпрыемства.

Трыкутнік фабрыкі „Дзвіна" за апошні час зразумеў, якія адказныя задачы стаяць перад фабрыкай. 6 чалавек лепшых актывістаў—працаўнікоў дала фабрыка на сталую работу — з іх 4 партыйца і 2 комсамольца. Тав. Квінта — сакратар партыйнага калектыву, будучы сам некалькі дзён у падшэфным сельсавеце, арганізаваў там масава-растлумачальную работу сярод калгаснікаў. Даведаўшыся, што ў калгасе „Сілач" зрываецца ўборка з-за недахопу рабочай сілы, тэрмінова мабілізаваў 11 лепшых комсамольцаў і накіраваў іх у калгас. Адная, усё гэта далёка яшчэ недастаткова.

Трэба памятаць, што за выкананне планаў сяўбы, збожжапаставак, лепшай якасці ўборкі ўраджая адказваюць шэфарганізацыі не ў меншай меры, чым сельсоветы. Актыўная дапамога шэфа павінна выразіцца ў неадкладным паляпшэнні работы сельсавета. Толькі той шэф можа лічыцца добрым шэфам, які дабіўся, каб падшэфны сельсавет, па ўсіх асенніх с. г. работах быў у перадавых радах.

МАРЫНА.

Такое шэфства нікому не патрэбна.

Шчоткамбінат шэфствуе над Нікалаёўскім сельсветам.

Але, як праходзіць асенне-уборачная кампанія ў падшэфным сельсавеце, наколькі выкананы планавыя заданні па збожжапастаўках, як абстаіць справа з азімай сяўбой, заблізным ворывам—на гэтыя і падобныя ім пытанні на шчоткамбінаце, як не дзіўна, адказаць не могуць, за выключэннем хіба трох чалавек, якія пасланы ў сельсавет на сталую работу.

Запытаешся, скажам, у старшыні фаўкома тав. Гарфункеля аб тым, што робіцца ў калгасах для аховы ўраджая ад расхіціцеляў. Аказваецца, што тав. Гарфінкель на гэта пытанне адказаць не можа, бо ён ні разу не быў у сельсавеце.

Чаго варта пасьля гэтага ўся шэфская работа шчоткамбіната, калі кіраўнік прафсаюзнай арганізацыі не ведае становішча свайго падшэфнага сельсавета, не ведае асноўных паказальнікаў яго работы?

Чаго варты соцумовы, заключаныя паміж кожным цэхам і калгасамі гэтага сельсавета, калі з моманту заключэння іх прайшло шмат часу і яны яшчэ ніводнага раза не праверяліся?

Такое шэфства нікому не патрэбна. Нікалаёўскі сельсавет чакае ад шчоткамбіната сапраўднай пролетарскай дапамогі.

БРЫСКІН.

Партарганізацыя чыгуначнага вузла, ачысціўшы свае рады ад сабатажнікаў перабудовы, павінна вывесці вузел з прарыву.

Зрабіць віцебскі чыгуначны раен і вузел узорным.

З выступлення старшыні гаркамісіі па чыстцы—сакратара ЦК КП(б)Б т. В. Ю. ЖЭБРОЎСКАГА на сходзе па чыстцы ячэйкі райкіраўніцтва 6-га раёна МБВ чыг.*)

Таварышы! Чыстка т. Васільева—начальніка 6-га эксплёатацыйнага раёна павінна быць сур'ёзнай палітычнай вытворчай школай, мабілізуючай масы на выкананне палітычных і гаспадарчых задач, высунутых ЦК нашай партыі і СНК перад транспартам у цэлым, у прыватнасці перад вашым раёнам.

Віцебскі вузел мае буйнае гаспадарчае і палітычнае значэнне. Т. т. СТАЛІН і КАГАНОВІЧ персанальна займаюцца пытаннямі чыгуначнага транспарта, яго перабудовай, работай. Віцебскі раён — важнейшая артэрыя, якая злучае паўднёвы хлеб з ленінградскай машынай. Ён важнейшы стратэгічны пункт. Ад такога раёну чыгункі як Віцебск патрабуецца самая ўдарная, самая ўзорная, самаадданая работа і лепшыя колькасныя і якасныя паказальнікі. А між тым, мы маем на вашым вузле выключна агідную работу, выключную засмечанасць класава чуждымі элементамі, б. памешчыкамі, папамі, кулакамі, якія вельмі часта падкапваюць магутны арганізм—сацыялістычны транспарт. У вашых радах, таварышы, мае месца выключная разболтанасць і расхлябанасць. Многія з вас праяўляюць ліберальныя адносіны да зрыўшчыкаў і сабатажнікаў рашэння ЦК і СНК аб транспарце.

Вось ты, т. Васільеў, адчытваючыся тут, праходзіш міма асноўных пытанняў перабудовы, рэканструкцыі чыгуначнага транспарта. Твае фармулёвачкі гумавыя, іх можна расцягнуць і растлумачыць як каму заўгодна, яны носяць фармальна-чыноўніцкі характар, і па сутнасці атрымліваюцца здзекі над чысткай партыі. Твая праверка павінна садзейнічаць справе перабудовы транспарта і зразумела, што ўвільванне ад асноўных пытанняў, справе не дапаможа, а хутчэй пашкодзіць.

Вымяральнікі ў вас пагоршыліся, спаранная язда ідзе назад і гэта мы павінны кваліфікаваць палітычнай мовай. Як назваць такое становішча? (Голас з месца: „САБАТАЖ"). Правільна—гэта захаваны сабатаж. Бо адкрыта зараз ні адзін сабатажнік не адважыцца выступіць супроць рашэння партыі. Яны, сабатажнікі, фармальна прыймаюць правільнасць рашэння, а па сутнасці сабатуюць. Зразумела, што за раён адказвае не толькі тав. Васільеў, але і ўся партыйная арганізацыя, якая павінна цягнуць усіх і паказваць прыклады ўзорнай работы, але ўсё-ж у першую чаргу і больш за ўсіх павінен адказваць начальнік раёна тав. Васільеў.

Васільеў ведае чыгунку, ён патомствены чыгуначнік, ён ведае транспарт як свае пяць пальцаў і натуральна, што да яго у час чысткі павінны быць прад'яўлены павышаныя патрабаванні. Вось вы, прысутнічаючыя тут, задаеце, пытанні тав. Васільеву і плаваеце пытаеце аб дробязях, а Васільева трэба правяраць над пунктам посліду таго, як перабудавана работа на транспарце на аснове пастановы ЦК і Саўнаркома, як ён змагаецца з сабатажніцкімі тэндэнцыямі, як ён забяспечыў аперацыйнасць і канкрэтнасць у рабоце, у якой сувязі ён знаходзіцца з рабочымі масамі, як ён змагаецца з чужакамі і г. д. Па гэтых пытаннях яго трэба браць моцна.



Мне здаецца, што і ў вас, і ў Васільева многа коснасці ў рабоце. Працуеце вы па шаблону (Голас: «Правільна»). А зараз краіна працуе на аснове новых метадаў—сацыялістычных метадаў працы. Тут патрабуецца вялікая гнуткасць і вялікая паваротлівасць. Вось, напрыклад, прыедзе ў вашу арганізацыю інструктар і ў сваіх вывадах адзначыць тысячу адзін недахоп і іх прыходзіцца прызнаць. Ён з галавы не выдумляе, а канстатуе са праўднае становішча рэчаў, ён новы чалавек і яму відней, яго вока бачыць увесь тэй бруд, якім вы абраслі і з якім вы звыклісь. Кансерватызм-вялікая небяспека на транспарце, недарма ў рашэннях ЦК і СНК аб транспарце запісана, што галоўная небяспека не ў тым, што на транспарце ёсць не дахопы, а ў тым, што да гэтых недахопаў прызвычаіліся, іх не прымячаюць, а калі не прымячаюць—значыць утойваюць.

Таварышы, у вас арганізаваны палітаддзел, трэба яму аказаць максімальнае садзейнічанне і дапамогу з боку ўсіх рабочых і спецыялістаў. Мы не сумняваемся, што палітаддзелы на транспарце дабіўцца такіх-жа рэзультатаў у рабоце, як і палітаддзелы МТС. ЦК партыі даў вам моцнага добрага работніка ў якасці начальніка палітаддзела—тав. ВАСІЛЬКОЎСКАГА. Трэба яго падтрымаць, дапамагчы яму. Тав. Васількоўскаму і тав. Васільеву трэба мацней, па-большэвіцку завярнуць справу. Ты, тав. Васільеў, ліберальнічаеш, невыстарчальна моцна б'еш сабатажнікаў. Улічы гэту справу. Ты адказваеш у першую чаргу за становішча раёна і вузла. А вы, таварышы, павінны мацней узяць яго ў работу. Мала таго, што ён сядзіць да двух гадзін начы ў кіраўніцтве. Можна сядзець і да самай раніцы, але толку ў гэтым будзе мала. Помніце, як тав. СТАЛІН гаварыў, што ён бачыў на Енісеі грабцоў, якія ў навальніцу кладуцца на дно лодкі, а хвалі пачынаюць трапаць лодку ва ўсе бакі? Такіх людзей нам непатрэбна. Нам патрэбны такія людзі, якія ў буру яшчэ мацней налягаюць на вёслы і ўздымаюць парусы.

Зараз мы правяраем вашу ячэйку. Вывады будзем зацвярджаць тыдні праз два. Здолееце вы дамагчыся перакону ў тэрмін—значыць добра, не здолееце—паўстане пытанне аб паўторнай чыстцы. Ад імя гарадской камісіі мы патрабуем ад партыйцаў, комсамольцаў самаадданай большэвіцкай работы, барацьбы з чужакамі і прымірэнцамі да іх. Я заклікаю беспартыйных рабочых, каб яны сапраўды дапамаглі нам ачысціць вашу ячэйку ад чужакоў і сабатажнікаў, рушыць віцебскі раён і вузел наперад да новых перамог, зрабіўшы іх узорнымі не толькі па МВБ, але і лепшымі ва ўсім Совецкім саюзе. Вось тады мы скажам: чыстка прайшла ў вас сапраўды па-большэвіцку! (АПЛЁДЫСМЕНТЫ).

*) Па жывому запісу.

Вытворчы ўздым дасягнуты ў час чысткі, не замацаваны.

З часа сканчэння чысткі і індывідуальнай праверкі членаў і кандыдатаў партыі ячэйкі голкавай фабрыкі прайшло два з паловай месяцы. Тэрмін больш чым дастатковы для таго, каб патрабаваць ад комуністаў фабрыкі рэальных паказальнікаў па перабудове работы.

Як жа ячэйка на самай справе рэалізуе пастанову камісіі па чыстцы?

Спачатку некалькі лічбаў: прамфінплан за другі квартал выкананы на 63 проц., за жнівень—на 57 проц. Першая дэкада верасня дала 53 проц. З гэтага відаць, што эрухі ў рабоце фабрыкі ніякага няма. Больш таго, пасля чысткі, бюро ячэйкі самазаспакоілася, не прымаючы мер да ліквідацыі ганебнага прарыва, да выкання прамфінплана.

Адкуль асноўныя прычыны адставання фабрыкі, трэба лічыць адсутнасць патрэбнай сыравіны. З за гэта фабрыка работае з перабоямі. Аднак, дырэкцыя не прымае мер да забеспячэння фабрыкі сыравінай, шляхам пасылкі агентаў у прамысловыя гарады Савецкага саюза. За тое, кожны месяц 400 руб. траціцца на тэлеграмы, якія штодзённа дасылаюцца ў трэст з патрабаваннем сыравіны. А вынікаў ад гэтых тэлеграм няма ніякіх. Прычына зрыва выканання прамфінплана ляжыць ня толькі ў недахопе сыравіны: нават пасля чысткі ў цэхах пануе абязлічка, дрэнная расстаноўка рабочай сілы, ураўнілаўка. Узяць хаця б такі прыклад. Кваліфікаваны рабочы шліфоўшчык атрымлівае 150 руб. у месяц, а рабочы рубшчык—чорнарабочы атрымлівае амаль столькі-ж.

Поўны рабочы дзень тут не выкарыстоўваецца. З-за дрэннай арганізацыі працы, адсутнасці над рукой належных інструментаў, нікчэмкай бегавіны, частага пакурвання з 7-гадзіннага рабочага дня 2 гадзіны, а то і больш ідуць упустую.

У цэхах многа брака. Штодзённа выпрадаваная прадукцыя дае 30 проц. брака, а то і больш. Дасканалага вучота брака адміністрацыя не вядзе.

Узімку арганізуем—самазаспакойваецца сакратар ячэйкі тав. Брук.

Аб тым, што фабрыка мае магчымасці выйсці з прарыва і што справа залежыць ад мабілізаванасці партыйцаў у першую чаргу і ўмення павесці за сабой масу беспартыйных рабочых гаворыць той факт, што ў час чысткі ячэйкі, калі бюро мабілізавала актыўнасць партыйцаў і беспартыйных рабочых, выкананне прамфінплана з 48 проц., падвысілася да 78 проц.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што партмасавай работы сярод членаў партыі і беспартыйных рабочых ячэйка як і раней не вядзе. І гэта ў той час, калі фабрыка выканала жнівенскі план на 57 проц.

Праверком даў ясныя, чоткія паказанні ў далейшай рабоце ячэйкі, але гэтыя паказанні не рэалізуюцца ячэйкай і адсюль буйнейшыя прарывы ў яе рабоце. МАКАРАЎ, БАС.

Вынікі слабай увагі да кузні кадраў.

Перад школай фабрычна-завадзкога вучнёўства (ФЗВ) стаіць важная і пачэсная задача—падрыхтаваць кваліфікаваных палітэхнічна-адукаваных, палітычна-свядомых рабочых кадры для нашай соцыялістычнай прамысловасці. У даным выпадку фабзавуч швейнікаў заклікан падрыхтаваць кадры для швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі».

Праходзіўшая чыстка і праверка партячэйкі ФЗВ яскрава паказала, што партыйная ячэйка фабзавуча дрэнна справілася з пастаўленымі перад фабзавучам задачамі, што яна не ўзначаліла вытворчую, вучэбную і выхаваўчую работу сярод фабзавучнікаў.

Толькі 78 проц. паспяховасці па вытворчым навучанні, вялікі процант адсева, да пачатка навучальнага года непадрыхтаванасць памяшкання для вучэбнай часткі (яно не адрамантавана), дрэнная пастаноўка аховы працы (няма нават аптэчкі) паўнейшы правал грамадскай работы—вось ганебныя паказальнікі, з якімі фабзавуч сустрэў чыстку сваёй партыйнай ячэйкі.

Толькі за адзін дзень перад чысткай бюро партыйнай ячэйкі на чале з сакратаром ШЭНКІНЫМ пачала «кіраваць» камсамольскай ячэйкай і фабкомам—заслухала іх справаздачы. Ці не характарызуе ўжо гэты адзін факт «прадукцыйную» дзейнасць бюро партячэйкі?

Сакратару камсамольскай ячэйкі т. ПАЗНЯКОВУ, рабочаму выдучэнцу, герою пяцігодкі бюро не дапамагала і ў выніку камсамольская работа фабзавуча апынулася на вельмі нізкім узроўні, авангардная роля камсамольцаў на вытворчасці зусім не адчуваецца, а для таго, каб перад чысткай сябе застрахаваць—знялі Пазнякова з работы. Перманальную чыстку праходзіць дырэктар член партыі з 1920 г. ШТЭЙНЦАЙГ. Чыстка паказала, што Штэйнцайг ігнараваў работу прафесыянальнай, камсамольскай арганізацый. Наогул для яго характэрна кінутая ім аднойчы рэплікa «што мне вазіцца з малымі».

Ён кіруе работай фабзавуча „наогул"—з кабінета. У цэху ён бывае вельмі рэдка, і калі бывае, то не бачыць непаладак, якія маюцца ў цэху. Ён не ведае, што матор прастаяў некалькі гадзін у той самы дзень, калі Штэйнцайг праходзіў чыстку і на сходзе нават вдзівіўся, калі на гэта яму ўказалі.

Штэйнцайг не ў курсе справы работы фабзавуча. На сходзе па чыстцы ён быццам такія лічбы, як колькасць вучняў. Не ведае іх соцыяльнага стану, не ведае як абстаіць з падсправаздачнымі сумамі, Штэйнцайг лічыць, што гэта справа загадчыка гаспадаркі..

Штэйнцайг да большэвікоў прышоў ад групы меншавікоў інтэрнацыяналістаў. Таму невыпадкова праварком паставіў Штэйнцайгу пытанні: „У чым жа розніца паміж 2, 2 1/2 і 3 (комуністычным) інтэрнацыяналамі? Здавалася б што Штэйнцайг на сходзе, дзе прысутнічалі амаль усе вучні ФЗВ, разгарне малючак усёй зрадніц ФЗВ, разгарне малючак усёй зрадніц ФЗВ, разгарне тое прынцыповае бязбоннае паказа тое прынцыповае бязбоннае паказа тое прынцыповае бязбоннае паказа між імі і 3 інтэрнацыяналам. Але гэтага, Штэйнцайг не зрабіў.

Ён не паказаў зрадніцкай палітыкі другога інтэрнацыянала ў час імперыялістычнай вайны, калі яго прадстаўнікі галасавалі за вайсковыя крэдыты, яго дапамогу інтэрвентам супроць Совецкага саюза і на соцыялфашысцкую дзейнасць другога інтэрнацыянала.

Аб гэтым Штэйнцайг умоўчвае, чому? Што тут справа ў палітычнай непісменнасці? Не, Штэйнцайг у гэтым годзе скончыў камвуз. Значыць справа ляжыць глыбей, значыць ён не разброіўся поўнасьцю, не ажыў яшчэ традыцый меншэвізма.

Калі да гэтага дадаць яго выпад супроць крытыкі яго, Штэйнцайга, памылак з боку т. Саўчанка (моў, я вышэй Саўчанка і яе крытыкі і наогул не жадаю адказваць на яе запытанні),—то выявіцца поўнасцю твар гэтага «кіраўніка» ФЗВ.

Трэба спыніцца на становішчы разгортвання самакрытыкі ў ФЗВ. Насценгазэта і штодзённі па істужках пачалі выходзіць толькі ў час чысткі ячэйкі. І калі ў іх былі змешчаны нататкі аб хуліганскіх учынках і недысцыплінаванасці вучняў МАЖЭЙКА і ГАРБАЧЭЎСКАГА, дык апошнія ў штодзённы істужкі закрэслілі свае прозвішчы, а ў агульна фабзавучнай насценгазэце, дзе была закранута іх сяброўка ЦІМАШЭНКА—проста вырэзалі заметку.

На сходзе па чыстцы выступілі толькі адзінкі вучняў—уся маса фабзавучнікаў маўчала. Адсюль паўстае вялікая задача перад партыйнай ячэйкай, каб разгарнуць смелую крытыку і самакрытыку «не зважаючы на асобы».

Нельга не адзначыць і работу комуністаў—інструктароў Казлінера, Зэльдзіна, Наноса і Катышава. Апошнія не вызначаюцца тымі педагогамі, кіраўнікамі вытворчага навучання, выхавацелямі ў пролетарскай гартоўні дзяцей вёскі і местачка, якія складаюць пераважную большасць фабзавучнікаў. Казлінер не вучыць авалодваць працэсам вытворчасці, прапускае дрэнную якасць прадукцыі, сам перарабляе псаваныя аперацыі, не дае навыка вучням, робіць высокажкасна свае аперацыі. Катышаў вельмі рэдка бывае на сваім вучастку, пускаючы работу на самацёк. Зразумела, што частыя адлучкі інструктара Катышава зрабілі дрэнны уплыў і на вучобу і на дысцыпліну фабзавучнікаў яго вучастка Гэты самы Катышаў вельмі мала зрабіў як кіраўнік бытавога сэктара фабкома для паляпшэння бытавых умоў вучняў. Інструктар Зэльдзін на сваім вучастку стварыў такія ўмовы работы, што некаторыя вучні... плакалі. Зэльдзін ухіліў ад партыі той факт, што яго жонка займалася гандлем, а сам ён саматужнічаў без дагавора з прафсаюзам. Інструктар Наноса ніякай грамадскай работы сярод вучняў не вядзе і на працягу 15 месяцаў не плаціць членскіх узносаў у партыю, чым праявіў сваю недысцыплінаванасць.

Нельга прайсці міма таго, што кіруючыя арганізацыі фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі" не ўдзялі патрэбнай увагі фабзавучу швейнікаў—кузніцы кадраў для яе самой. Фабком фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі" не замічыў патрэбным заслухаць на сваім пасяджэнні інфармацыю аб рабоце фабкома ФЗВ і сваёй вылучэлкі Саўчанка.

Партыйны камітэт павінен цікавіцца работай фабзавуча, штодзённа дапамагаць выхоўваць фабзавучнікаў, забяспечыць авангардную ролю комуністаў у фабзавучы. Гэта кіраўніцтва яшчэ больш патрэбна зараз, пасля ўскрыцця тых глыбокіх прарываў, якія меліся і яшчэ дадаткова выяўлены ў час чысткі партыйнай ячэйкі.

КАЗАНСКІ, БЕЛЕНЬКІ, УСЫСКІНА.

РАСТУЦЬ ГІГАНТЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ІНДУСТРЫІ.



І. Г. ЖУРАЎЛЁЎ.
САКРАТАР ГАРКОМА КП(б)Б

ПАСТАНОВУ ЛІПЕНЬСКАГА ПЛЕНУМА ЦК І ЦКК КП(б)Б—ПЕРАТВАРЫЦЬ У РЭАЛЬНЫЯ СПРАВЫ.

Ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове аб рабоце прамысловасці, як цэнтральную задачу перад фабрычна-заводзкімі арганізацыямі паставіў: „Неадкладнае ўмацаванне цэхавай ячэйкі і канцентраванне ўсёй арганізацыйна-партыйнай і палітычна-масавай работы ў цэху, партгрупе, з тым, каб кожнага камуніста зрабіць сапраўдным арганізатарам вытворчага і палітычнага жыцця на прадпрыемстве сярод рабочых".

Ці спраўляецца віцебская партыйная арганізацыя, яе паасобныя звенні з гэтай цэнтральнай задачай? За апошні час асабліва лёгкая прамысловасць Віцебшчыны, якая ва ўсёй народзе гаспадарцы БССР адыгрывае вельмі важную ролю, падцягнулася. Крывая выканання прамфінплана на прадпрыемствах Наркамлёгпрама з 77,3 проц. за першае паўгоддзе ўзчалася да 91,4 проц. за жнівень. На прадпрыемствах Наркамцяжпрама яшчэ менш—96,8 проц. Рад фабрык і заводаў («Чырвоны металіст», акулярная фабрыка, панчошна трыкатажная імя Клары Цэткін, ільнапрадзільная „Дзвіна", швейная „Сцяг індустрыялізацыі" і інш.) дасягнулі выканання свайго вытворчага задання за жнівень 102—105 проц.

Гэтыя першыя эрухі мы маем, галоўным чынам, у выніку дэталёвай праверкі пастановы ЦК КП(б)Б аб віцебскай партыйнай арганізацыі, у выніку правядзімай чысткі партыйных радоў. Чыстка партыі сапраўды мабілізуе рабочых на выкананне прамфінплана, на ліквідацыю таго глыбокага прарыва, у якім доўгі час знаходзілася віцебская прамысловасць.

Аднак, не гледзячы на рад дасягненняў у рабоце паасобных прадпрыемстваў, неабходна адзначыць, што пастанова пленума ўсё яшчэ невыстарчальна прапамяцца ў рабоце фабрычна-заводзкіх партарганізацый. Пры наяўнасці ўсіх магчымасцей мы яшчэ не дабіліся 100-процантнага выкання колькасных і асабліва якасных паказальнікаў прамфінплана па ўсіх прадпрыемствах. Больш таго, на паасобных прадпрыемствах («Прафінтэрн», абутковая імя Лекерта, панчошная „КІМ") мы маем паўнейшае ігнараванне якасці прадукцыі. Кіраўніцтва фабрыкі „КІМ" проста ігнаруе пастанову ліпеньскага пленума. Яно не зрабіла для сябе абсалютна ніякіх вываў з папярэджання пленумам асабіста дырэктару фабрыкі тав Фрэйдзіну аб ліквідацыі прарыва на фабрыцы.

Некаторыя партарганізацыі больш сур'ёзна ўзяліся за перабудову сваёй работы, у выніку чаго ёсць значныя эрухі. Вось завод сельгасмашынабудаўніцтва „Чырвоны металіст" за жнівень месяц выканаў сваю вытворчую праграму на 103,6 проц. Ён вышаў з адстаючых у рады перадавых прадпрыемстваў.

Партыйная арганізацыя завода зразумела, што ў далейшым кіраваць са сваіх кабінетаў нельга і, таму з усёй сур'ёзнасцю пачала праводзіць у жыццё пастанову пленума аб паляпшэнні тэхнічнага кіраўніцтва сапраўдным набліжэннем яго да нізавога вытворчага звяна. 12 адказных тэхнічных работнікаў перакінуты непасрэдна ў цэхі і участкі Так, загадчык вытворчасці тэхнік Сьліў перакінут на работу ў якасці загадчыка механа-зборачнага цэха. Загадчык аддзела тэхналогічных працэсаў тэхнік Бараўкін назначан намеснікам загадчыка ліцейнага цэха, тэхнік Баскін, які раней працаваў у аддзеле рацыяналізацыі, зараз працуе майстрам зборачнага цэха.

Такія аддзелы, як рацыяналізацыі, ТНБ, тэхналогічнага працэсу, кантрольны, якія ў свой час існавалі пры заводакіраўніцтве, зараз знайшлі сваё месца ў цэху, на тым ці іншым вытворчым участку. Адсюль умацаваліся тэхнічнае кіраўніцтва, кантроль над якасцю выпускаемай прадукцыі У выніку гэтага брак у ліцейным цаху з 25—30 проц., знізіўся зараз да 7—8 проц.

Па лініі партыйнай і прафесіянальнай мы таксама маем на гэтым заводзе першыя крокі па перабудове работы. Парткалектыў і заўком узялі ўсім правільны курс на ўмацаванне сярэдняга парт. прафзвяна. Работнік парткалектыва тав. Пуркоў працуе зараз сакратаром партыйнай ячэйкі кавальнага цэха. Работнік заўкома тав. Вэнгер—старшынёй цэхкамітэта гэтага ж цэха. Тав. Ізаноў, культработнік заўкому—працуе старшыней цэхкамітэта механа-зборачнага цэха і г. д. Самі работнікі парткалектыва (сакратар тав Гаўрыльчык) і заўкома менш за ўсё сядзяць у сваіх кабінетах, а ў большасці выпадкаў бываюць у цэхах, на паасобных вытворчых участках, сярод гушчы рабочых мас.

Безумоўна гэтыя добрыя бакі работы трыкутніка завода значна спрыяюць выкананню прамфінплана. Але гэта толькі першыя крокі. Парткалектыў і ячэйкі яшчэ не заняліся ўмацаваннем нізавога звяна—партгрупы. Напрыклад, сакратар парт'ячэйкі ліцейнага цэха тав. Альшэўскі не ведае сваіх партарганізатараў, з імі ніякай работы не праводзіць. На вядучым вучастку—фармоўка корнярэзкі—ужо два тыдні як партарганізатар Бавалеўскі пашоў у адпачынак, а на яго месца і зараз ніхто не выначан. Альшэўскі аб гэтым ведае, але ніякіх мер не прымае, у той час, як на гэтым участку злосныя бракаробы (Кошалеў і інш.) да апошняга часу псуюць прадукцыю, даючы штодзённа 30—40 проц браку.

Як жа стаіць справа з перабудовай арганпартмасавай работы на ільнопрадзільнай фабрыкі «Дзвіна»?

У свой час кіраўніцтва парткалектыва фабрыкі вельмі „праславілася" адарванасцю не толькі ад партарганізацыі, але ад усяго рабочага калектыва. «Мёртвыя душы», аб якіх пісалі «Правда» і «Звязда», з'яўляюцца лепшым доказам гэтага.

Абноўдена кіраўніцтва добра ўлічвае, што самае галоўнае—гэта цесная сувязь з шырокай масай рабочых Вось прыклад: на фабрыцы працаваў у якасці намесніка тэхнарука нейкі Шанін, да рэчы, член партыі. Шанін прыбыў на фабрыку „Дзвіна" з рэкамендацыйным лістом ЦК саюза ільнапрадзільнікаў, у гэтым лісце ўказана, што Шанін—інжынер, камандыруецца на фабрыку „Дзвіна" для ўмацавання тэхнічнага кіраўніцтва. Аказваецца, што Шанін зусім не інжынер, а тэхнік, які правяраў работу на фабрыцы «Серп і молат», адкуль быў зняты. Дакумант аб яго добрай мінулай рабоце і кваліфікацыі набыт ім жульніцкім спосабам.

На фабрыцы „Дзвіна» замест сапраўднага сістэматычнага кіраўніцтва, Шанін сістэматычна п'янстваваў, дэзарганізоўваў маладых спецыялістаў, наўмысна зніжаў прадукцыйнасць машын і г. д. Шанін праходзіў чыстку на фабрыцы «Дзвіна», але яго сапраўдны твар у часе чысткі не быў выкрыт. І толькі зараз, калі новае партыйнае кіраўніцтва спусцілася ў цэхі, мабілізуючы рабочых на разгортванне самакрытыкі, твар гэтага жуліка з парквілетам у кішэні ўскрыт. Шанін знят з работы і выключан з партыі.

Дрэнная перабудова арганпартмазавай работы засталася і зараз, як спадчына мінулага. Існуючыя ў сістэме парт-арганізацыі зменавыя ячэйкі сябе не апраўдваюць. І гэта зразумела, бо адна зменавая ячэйка абслугоўвае старыя і новыя карды, стужковыя цэхі, старыя і новыя ватары і матальны цэх. Безумоўна, ахапіць сваім парткіраўніцтвам усе гэтыя звенні немагчыма. Партгрупы ёсць толькі ў стара стужковым і матальным цэхах. У такіх вядучых цэхах, як старыя і новыя карды і ватары, нават няма партарганізатараў. Паводле слоў самога сакратара парт'ячэйкі—т. Баранавай „уся апора—на прымацаваных ад парткалектыва і парткіраўніцтва".

Ну, а як-жа стаіць справа на участках, якія забяспечаны партгрупамі? Вось партгрупа мотальнага цэха — група «Б». Партарганізатар тав. Базылёва працуе на фабрыцы з 1925 г. Партгрупа дабілася авангардной ролі комуністаў на вытворчасці. Сама тав. Базылёва штодзённа выконвала сваё вытворчае заданне на 107 проц. Яна, як і іншыя комуністы яе партгрупы (Піскунова, Чаплінская, Рагажынская і інш.), канчаткова ліквідавала пэрамоты і недамоты. Партгрупа выпускае са свайго варштата добраякасную прадукцыю. За апошні час фабрыка ў цэлым дабілася выкання колькасных паказальнікаў прамфінплана на 102 проц. Але якасныя паказальнікі застаюцца ўсё яшчэ нездавальняючымі. Угар у прадзенні перавышае планавы на 3 проц Замест зніжэння сабекошта прадукцыі на 7,5 проц., фактычна—на 5,5 проц. Безумоўна, што гэтыя недахопы фабрыкі можна канчаткова ліквідаваць толькі ў тым выпадку, калі арганпартмасавая работа будзе сапраўды перабудавана, калі нізавое партзвяно будзе ўмацавана.

Мы маем рад прадпрыемстваў, як швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», партарганізацыя якой сапраўды сур'ёзна ўзялася за перабудову арганпартмасавай работы. Дзякуючы разгорнутай агітацыі сярод шырокай масы рабочых, накіраванай на ліквідацыю прарыва, фабрыка ў жніўні дабілася выканання прамфінплана больш, чым на 100 проц. Праўда, якасць прадукцыі ўсё яшчэ не на належнай вышыні. Аднак, мы маем такія прадпрыемствы, як швейная фабрыка „Прафінтэрн", дзе партмасавая работа не пастаўлена на службу прамфінплана. Партыйнае, прафсаюзнае і гаспадарчае кіраўніцтва проста прымірылася з прарывам, у якім доўгі час знаходзіцца фабрыка. Пры выкананні за жнівень колькасных паказальнікаў прамфінплана на 94 проц., фабрыка выпускае каля 4-х і больш процантаў браку. У адным толькі цэху паліто мы маем залежы звыш 4.000 адзінак. Уся работа на фабрыцы праводзіцца ў агульнафабрычным або цэхавым маштабе. На радзе нават вядучых участкаў (першы участак зменны «А» цэху паліто, у бручным цэху зменны „А") партарганізатараў зусім няма. Між тым, іменна на гэтых участках справа з якасцю стаіць асабліва дрэнна. 6 жніўня першы участак цэху паліто з-за вялікай колькасці браку прышлося часова прыпыніць.

На гэтай фабрыцы партарганізатары выпалі з-пад увагі парткіраўнікоў. Вось ужо два месяцы, як яны не склікаліся на нарады і ў сваёй штодзённай рабоце не атрымліваюць належнай дапамогі. На фабрыцы ёсць цэлы рад комуністаў, якія проста цягнуцца ў хвосце самых адсталых рабочых. Так, комуніст-работы цэху паліто Свірыдоўскі, які з'яўляецца партарганізатарам, сістэматычна псуе прадукцыю і нічым не адрозніваецца ад іншых бракаробаў.

Парткалектыў не працуе над выхаваннем актыва, не праўдзе яго на кіруючую работу. У самім бюро парткалектыву няма агітпраса і культсгрупа. Фабрычная шматтыражка вось ужо месяц, як з-за «адсутнасці рэдактара» не працуе. Сакратар парткалектыву тав. Памеранец скардзіцца, што няма людзей. Напраўда, людзі ёсць! Партарганізацыя фабрыкі налічвае ў сваіх радах 150 членаў і кандыдатаў партыі і пры добрай рабоце з актывам можа забяспечыць усе важнейшыя вучасткі парткіраўніцтвам.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што віцебскай партыйнай арганізацыі прадстаіць яшчэ вялікая і сур'ёзная работа па перабудове арганпартмасавай работы. Гэтаму участку гаркам КП(б)Б адзае і будзе аддаваць выключную ўвагу, бо ад яго перабудовы, ад сапраўднага ўмацавання сярэдняга нізавога партзвяна, разгортвання партмасавай работы сярод партыйцаў і шырокіх мас беспартыйных залежыць выкананне прамфінплана.

Гаркам КП(б)Б вынес спецыяльную пастанову, у якой вызначан рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўзбуйненню цэхачэек, па ліквідацыі зменавых ячэек, узбуйненню партгруп. У гэтай пастанове гаркам КП(б)Б абавязвае сакратароў парткалектываў і ячэек неадкладна перакінуць комуністаў з розных аддзелаў фабрычнага заводакіраўніцтва ў нізавыя вытворчыя звенні для ўмацавання парт-прасловкі на вытворчасці, умацавання нізавога партзвяна. Для падрыхтоўкі работнікаў гэтых звенняў пры гаркоме арганізуюцца 3 дзённыя курсы—канфэрэнцыі партгруп і месячныя курсы для сакратароў парт'ячэек. Выпрацаваны рад мер па паляпшэнні абслугоўвання партарганізацыямі начных змен, паляпшэнні колькаснага і якаснага ўліку партарганізацыі, работы прымацаваных, выканання нагрузак і асабліва паляпшэння работы з кандыдатамі і спачуваючымі.

Гарадскі камітэт партыі вітае ініцыятыву рабочых ільнапрадзільнай фабрыкі «Дзвіна», якія звярнуліся ў газету „Звязда" з просьбай абвясціць усебеларускую перакастрычніцкую пераклічку на лепшую рэалізацыю пастановы пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасці. Гэта пераклічка сапраўды мабілізуе рабочых на канчатковую ліквідацыю прарываў, на поўнае выкананне колькасных і асабліва якасных паказальнікаў прамфінплана. Віцебская прамысловасць мае для гэтага ўсе магчымасці, неабходна толькі чоткае, аперацыйнае кіраўніцтва, сапраўдная перабудова арганізацыйна-партыйна-масавай работы.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА.

АЎЛАДАННЕ ШЫРОКІМІ МАСАМІ ТЭХНІКАЙ — МАГУТНЫ ВАГАР У БАРАЦБЕ ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ.

Справа гонара кожнага інжэнерна-тэхнічнага работніка выступіць са сваім вопытам работы на трыбуну перадкастрычніцкай пераклічкі.

Панчошнікі узялі самаабавязацельствы.

...ы, работніцы, рабочыя, ІТР і ...лікачыя панчошнай фабрыкі імя К...ры Цэткін вітаем ініцыятыву ра...ых ільнапрадзільнай фабрыкі «Двіна» аб абвяшчэнні праз «Звязду» ўсебеларускай перадкастрычніцкай пераклічкі па рэалізацыі пастаноў ...пенскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б. ...наша фабрыка ў рэзультаце дэталёй распрацоўкі пастановы ЦК КП(б)Б аб віцебскай партарганізацыі і ...пенскага пленума ЦК і ЦКК дабіла...ся жвіўві выканання прамфінплана на 102,3 проц. Вузкім месцам нашай рабоце ўсё яшчэ застаецца якасць прадукцыі. Так, у жвіўві мы дали 1-га гатунку, замест планавых 78 проц.—66,5 проц. Замест дапушчаных планам 8,3 проц. брака, мы дали 19,9 проц. Такі вялікі процант брака, у якім галоўным чынам вінаваты мы самі, ганьбіць нашу фабрыку. Змазвае нашы дасягненні ў выкананні колькасных паказальнікаў.

Каб тым, што можна даваць добрую якасць прадукцыі паказвае работа лепшых, перадавых ударных брыгад. Брыгада Гольдзінай дабілася лішэння штопкі. Замест прадугледжаных планам 12 проц., яна давяла норму да 3,8 проц., брыгада Гуткіна—да 3,9 проц., брыгада Буткевіча да 0,5 проц.

Мы больш з такім станозішчам мірыцца ніяк не можам. Уключаючыся ў абвешчаную «Звяздой» усебеларускую перадкастрычніцкую пераклічку, ставім сабе задачай прысці да кастрычніцкіх свят з перамогай у выкананні колькасных і асабліва якасных паказальнікаў.

Мы абавязуемся склікаць злёт гаслрахункавых брыгад, праверыць ход выканання пастановы фабрычнай канферэнцыі па якасці. Склікаць на асобных вучастках нарады бракаробаў сумесна з лепшымі ўдарнікамі, з мэтай перадачы вопыту работы.

На асобных вучастках, брыгадах у дапамогу кантралёрам па якасці, вылучыць грамадскіх інспектараў па якасці з лепшых ударнікаў. Арганізаваць фства перадавых ударнікаў па якасці над малакваліфікаванымі рабочымі, якія даюць прадукцыю нізкай якасці.

Адначасова з работніцамі, вывучаючымі тэхмінімум, ахапіць тэхвучобай шырокія масы работніц, асабліва па трыкатажу, насадны і кетлёўды. Склікаць агульнафабрычную вытворчую нараду сумесна з фарбарна-апратурным цэхам фабрыкі «КІМ» з мэтай выпрацоўкі канкрэтных мерапрыемстваў па лепшай увязцы работы.

Для прэміявання лепшых брыгад, паасобных ударнікаў, якія да кастрычніцкіх свят прыдуць з выкананнем прамфінплана па колькасных і асабліва па якасных паказальніках па асваенні новага абсталявання, дырэкцыя фабрыкі вылучае фонд у 2 тыс. рублёў.

Рэдкалегія шматтыражкі абавязуецца на сваіх старонках, у «Звяздзе» і «Віцебскім пролетарыі» шырока асвятляць работу сапраўдных змагароў за якасць, выкрываць канкрэтных бракаробаў, сістэматычна асвятляць выкананне ўзятых на сябе—зарыз у часе ўключэння ў пераклічку—абавязацельстваў.

Вядучы на сябе гэтыя абавязацельствы, мы катэгарычна патрабуем ад рабочых Рэўтаўскай ільнопрадзільнай фабрыкі і „Красный перевал" снабжаць фабрыку добраякаснай прадукцыяй. ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЛЁТА ЎДАРНІКАЎ ЯКАСЦІ МЫ АБАВЯЗУЕМСЯ ШЧЫЛЬНА ЎВЯЗАЦЬ СА ЎСЁЙ ГЭТАЙ РАБОТАЙ.

Прыйсці да кастрычніцкіх свят з поўным выкананнем колькасных і якасных паказальнікаў на аснове рэалізацыі пастаноў ліпенскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б—такую задачу мы ставім перад сабой у час пераклічкі і за яе ажыццяўленне будзем па-большэвіцку змагацца штодзённа, штогадзінна, кожны на сваім вытворчым вучастку.

Па даручэнні рабочых, работніц і ІТР фабрыкі: работніцы-ўдарніцы: КАЛІЎКІНА, ПАПЫЛЬЧАНАКА, ПІСКУНОВА, ГЕНАЕВА, ШКОЛЬНІК, ОСІПАВА, НІКІЩІНА, ДЗЕЧУК, ЛІЗБАНАВА, СОСНЭР, ЮР'ЕВА, ФРЭЙДЗІНА, БУТКЕВІЧ, ГУТКІНА.

План правядзення падрыхтоўчай работы да усебеларускага і гарадскога злёта ўдарнікаў якасці і правядзення перадкастрычніцкай вытворчай пераклічкі.

(ЗАЦВЕРДЖАН ПРЭЗЫДЫУМАМ ГАРПРАФСОВЕТА).

◆ Прадкастрычніцкую вытворчую пераклічку і падрыхтоўку да ўсебеларускага гарадскога злёта ўдарнікаў якасці ператварыць у масава-палітычную кампанію творчай актыўнасці рабочых мас, на барацьбу за выкананне прамфінплана, асабліва па якасных паказальніках, пад знакам барацьбы за права ўдзела ў гарадскім усебеларускім злёце ўдарнікаў якасці і заваявання пераходнага сцяга імя ЦК КП(б)Б, ЦСПСВ і ЦК ЛКСМВ.

◆ Паставіць задачай увлючыць у масавую падрыхтоўчую работу да ўсебеларускага і гарадскога злёта ўдарнікаў якасці і ў прадкастрычніцкую пераклічку, кожнае прадпрыемства, цэх і брыгаду, кожнага рабочага ўдарніка і ІТР.

◆ Усю работу праводзіць на аснове праверкі выканання рашэнняў студзеньскага пленума ЦК і ЦКК УсеКП(б), ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б і пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб становішчы Віцебскай партарганізацыі; далей шай мабілізацыі шырокіх рабочых мас на практычнае ажыццяўленне гэтых рашэнняў.

◆ Прапрацаваць у пэрыяд падрыхтоўкі да злёта пытанне тэхнармірання і зарплаты: становішча і далейшыя мерапрыемствы тэхнічна-абгрунтаваных норм выпрацоўкі, узбуйнення яўна раздробленых норм—на металічнай прамысловасці і чугунку, узбуйнення аперацый і пераходна на брыгадны метад выпрацоўкі—па швейнай прамысловасці, інструктаж рабочых на асваенне норм, выкананне норм рабочымі адной прафесіі і працуючых на адным працэсе: праверыць становішча разлікових сталоў, парадак вылічэння зарплаты, пачынаючы з первічных запісаў, пабудаваўшы ўзорна зарплату ў цэху, праверыць правільнае выдаткаванне фондаў зарплаты і г. д.

◆ Па лініі ФЗМК арганізаваць праверку становішча прадпрыемствы, ушчыльненне рабочага дня, прадзман страваўшы растратчыкаў рабочага часа, арганізаваўшы таксама масавую самаправерку выканання гаспадарча-разліковых брыгад, асабліва ўдарнікаў і выяўленне ініцыятыўнікаў.

◆ У час падрыхтоўкі да XVI гадавіны кастрычніка, прамысловасць Віцебшчыны павінна палкам ліквідаваць сваё адставанне, выканаць прамфінплан па ўсіх паказальніках і асабліва па якасці, пакрыўшы заваёчанасць дзяржаве за мінулыя месяцы 1933 г.

◆ Абвясціць на кожнай фабрыцы і заводзе ўнутры фабрычна - заводскі кастрычніцкі конкурс на лепшы цэх, брыгаду, рабочага ўдарніка, ІТР. Для кіраўніцтва конкурсам і сістэматычнага ўліку спаборніцтва ФЗМК вылучыць конкурсныя камісіі.

◆ Праз шматтыражкі і насценгазеты, на падставе соцспаборніцтва правадзіць шырокі абмен лепшым вытворчым вопытам. Абагулены калектыўны матар'ял друкаваць у газетах „Віцебскі пролетарый", цэнтральных газет „Звязда" і „Рабочы".

◆ Паміж 1—10 кастрычніка па ўсіх прадпрыемствах склікаць злёты ўдарнікаў якасці, з абгаварэннем папярэдніх вынікаў спаборніцтва на лепшы цэх, брыгаду, на лепшага ўдарніка і ІТР. Да гэтых злётаў павінна быць праведзена шырокая праца па выкананні прапаноў канферэнцый па якасці, якія былі-б праведзены ў гэтым годзе. На злётах вылучаюцца дэлегаты на агульна-гарадскі злёт ударнікаў якасці, а таксама абгаварваюцца кандыдатуры для занясення на ўсебеларускую і гарадскую дошку гонара лепшых цэхаў і брыгад, асобных рабочых ударнікі і ІТР і на «чорную дошку» асобных бракаробаў і брыгад і фабрык з вывачкай работу па выкананні прамфінплана, асабліва па якасных паказальніках.

◆ Памі 25 і 27 кастрычніка правесці гарадскі злёт ударнікаў якасці, гераяў аўладання тэхнікай. Права мандата з рашаючым голасам на гэты злёт прадставіць тым фабрыкам і заводам, цэхам, брыгадам, якія выканаюць прамфінплан за верасень і кастрычнік па сёмуюяго паказальніка. На гарадскім злёце вызначыць дэлегатаў на ўсебеларускі злёт ударнікаў і абгаварыць кандыдатуры на ўсебеларускую «Чырвоную дошку».

◆ Прэміяванне лепшых цэхаў, брыгад, рабочых ударнікаў і ІТР прыўрочыць да 16 гадавіны Кастрычніцкіх свят. Кіраўнікам прадпрыемстваў вылучыць для гэтай мэты адзаведную суму сродкаў з фондаў прадпрыемстваў.

■ 19 верасня склікаць гар. канферэнцыю ІТР для распрацоўкі пытання аб перабудове работы паводле пастановы ЦК УсеКП(б) і Саўнаркома СССР аб Данбасе і мы уначным транспарце і пастановы ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б і ролі ІТР у злёте ўдарнікаў якасці.

◆ Правесці масавую праверку выкананні гаспадарчых і арганізацыямі рашэнняў ЦК аб перакліцы і правільным скарыстанні спецыялістаў на вытворчасці.

◆ У парадку праверкі работы па падрыхтоўцы да ўсебеларускага гарадскога злёту ўдарнікаў якасці, заслухаць на пасяджэнні прэзыдыума ГСПС, даклады кіраўнікоў асобных буйнейшых фабрык і заводаў.

■ Арганізаваць праверку матар'яльна бытавога абслугоўвання рабочых: грамадскае харчаванне, забеспячэнне гароднінай, скарыстанне сродкаў на пабудову кватэр і г. д.

◆ З мэтай практычнай дапамогі ФЗМК і арганізацыям у правядзенні падрыхтоўчай работы да злёта ўдарнікаў якасці і разгортванні прадкастрычніцкай пераклічкі, прымацаваць да буйнейшых прадпрыемстваў членаў пленума ГСПС.

◆ Арганізаваць на старонках „Віцебскі пролетарый" трыбуну абмена вытворчым вопытам „чорную" і „чырвоную" дошкі, разгарнуўшы прадкастрычніцкую пераклічку фабрык, заводаў, цэхаў і брыгад аб лепшым сваім вытворчым вопыце.

◆ Правесці на прадпрыемствах злёты рабкораў, прысвечаныя прадкастрычніцкай пераклічцы і падрыхтоўцы да злёта ўдарнікаў якасці. 16 верасня склікаць гарадскую нараду рэдкалегій шматтыражак і насценгазэт па гэтым пытанні.

◆ У бліжэйшыя дні арганізаваць масавы рэйд ГСПС ударнікаў друку сумесна з прафактывам па пытанні аб ходзе падрыхтоўкі фабрык і заводаў да агульна-заводскага, гарадскога і ўсебеларускага злётаў ударнікаў якасці і разгортвання прадкастрычніцкай пераклічкі.

ЯК Я ЗМАГАЮСЯ ЗА АСВАЕННЕ НОВЫХ МАШЫН.

Пачаў я сваю работу на фабрыцы імя К Цэткін на панчошных аўтаматах сістэмы „Ізад", „Карона" і іншых. Асноўнымі іх прыходзілася ...зата, бо не было у каго вучыцца. ...ханік, які ў нас работаў з Германіі, ...ак не жадаў паказаць нам уласнасці машын і не жадаў нам перадаць ...пыт сваёй работы.

Вось, напрыклад, на вязанне клетчатых носкоў патрабуецца асобная ...ноўка і разлік аўтамата і каб мы ...маглі гэта ўсвоіць, нямецкі механік рабіў гэта тады, калі мы не ...ылі. Але-ж не гледзячы на гэта ...час працы аўтамата я прыглядаўся ...ўстаноўкі і пачаў ужо пакрыху ...а асвайваць. Канчаткова ўсвоіць ...ноўку на вязанне клетчатых носкоў мне дапамог інжэнер з Ленінграда, які прыехаў на нашу фабрыку ...і абмена некаторых сістэм машын.

Бачачы ўсё гэта, нямецкаму механіку зрабілася сорамна і перад ад'ездам ён два разы нас сабраў і тое-сёе ...і перадаў.

Пасьля яго ад'езда я, як лепш ...оіўшы сістэму машыны, быў прызначан старшым механікам.

У сувязі з тым, што наша фабрыка ...934 года павінна перайсці канчаткова на трыкатаж, замест выробкі ...чох, я разам з некаторымі іншымі ...ітнікамі фабрыкі ў лістападзе ...32 года быў пасланы на Іванцеевую фабрыку Маскоўскай вобласці ...і азнаямлення з работай і механізмам трыкатажных машын Томпкінса, ...ія вырабляюцца на заводзе „Метал" ...Палтаве.

Вельмі хутка мне ўдалася іх асвоіць таму, што я ўжо меў некаторы ...ыт, галоўнае, я не лічыўся з ...ам работы, разбіраў іх, знаёміўся ...механізмам, з прызначэннем кожнай ...далі ў паасобку і ў час іх работы ...м на фабрыцы вызучаў іх «капрызы», а «капрызаў» маюць гэтыя машыны многа. Асноўная ў іх—гэта ...таноўка пецельных калёс, якіх ...аецца ў кожнага стала 4 камплекта ...а 3 штукі, а стол складаецца з двух ...шын.

Вось, напрыклад, у час практыкі на ...анцеевускай фабрыцы і работы машын ...стаў прыкмечаць, што машына ...кідвае петлі. Я зацікавіўся гэтым і ...аведаўся ў механіка, што ў сувязі з ...ым, што пяцельнае калясо ўстаноўлена нізка—з-за гэтага скідваюцца ...етлі. Альбо ламаюцца голкі кожную ...інуту—значыць таксама неправільна ...станоўлена пецельнае калесо. Такім ...ынам я даведаўся аб усіх прычынах ...аспрацаванасці і капрызах машын.

Вялікае значэнне мае таксама правільная ўстаноўка машын і на гэта я ...звярнуў асаблівую ўвагу пры ўстаноўцы іх у нас на фабрыцы, каб правільна зазначаць часьці, роўна іх патавіць, бо трэба сказаць, што завод „Метал", які іх выпрацоўвае, надбайдзе адносіцца да выраба некаторых ...астак. Узяць хаця-б дзяржалку, яны загатаўляюцца з вельмі крохкага шэрага чыгуна і часта ламаюцца. Мы, каб не затрымаць устаноўку машын, пачалі вырабляць іх самі з жалеза і аказваецца—яны лепш вытрымліваюць, чым чыгун.

Некалькі месяцаў таму назад, палтаўскі завод прыслаў нам машыны без заліўнога апарату для яго. Нельга было пусціць машыну, але ж, каб не спыняць работы, я, пры дапамозе рамонтнага цэха, дапасаваў заліўны апарат з другога класа, і, такім чынам пусцілі машыну ў ход, а паміж іншым завод і да гэтага часу не прыслаў нам гэтага заліўнога апарата.

Ведаючы, што вялікае месца ў нармальнай рабоце адыгрывае падрыхтоўка кадраў механікаў і работніц, якія павінны працаваць на гэтых машынах, — я адразу-ж па прыездзе арганізаваў курсы і падрыхтаваў 5 механікаў, якія зараз працуюць на дрэнна па рамонце і ўстаноўцы гэтых машын, за выключэннем Драбкіна, які падленьваецца і не хоча працаваць, не добрасумленна адносіцца да работы. Зараз зноў арганізавалі школу і я падрыхтоўваю яшчэ 8 механікаў. Работніц для вязальнага цэха мы бярэм тых, якія работалі раней на панчохах. З імі праходзім спецыяльны тэхмінімум па асваенні машын.

Вялікую ўвагу я звяртаю на змазку машын. Быў час, калі шорнікі, якія адначасова з'яўляюцца змазчыкамі машын, гэтага не рабілі і тады ледзь машына ня вышла са строя. Мы ўзялі вакол гэтага грамадскую думку, ударылі як след, і больш гэтага не паўтараецца.

Як недахоп у рабоце трыкатажнага ...участка трэба адзначыць адсутнасць у значнай колькасці рабочых плоскагубцаў, якія неабходны кожнаму рабочаму для выпраўлення голак. Аб гэтым ведае тэхнарук фабрыкі т. ГАРАВОЙ, і ён ніякіх мер не прыймае для здабыцця іх.

Такое-ж становішча і са шчоткамі для шліфоўкі петлеабразуючых калёсікаў. Аб гэтым таксама паставлен у вядомасць тэхнарук фабрыкі і загадчык аддзелам снабжэння СОРЫН і да набыцця іх ніякіх мер не прынята.

Наш участак павінен быў за тры квартала устанавіць 26 сталоў, альбо 52 машыны «Томпкінса», устанавіўжа 44 стала, альбо 88 камплектаў. План мы выконваем больш як на 100 проц., паменшылі і колькасць брака. Гэтага мы дабіліся дзякуючы асваенню тэхнікі машын.

Наш участак уключыўся у перадкастрычніцкую пераклічку і падрыхтоўку да Усебеларускага злёта ударнікаў якасці—гераяў аўладання тэхнікай. Змагаемся за мандат на права ўдзела у гэтым злёце. І гэты мандат сваёй ударнай работай мы дабёмся.

Майстра па трыкатажных машынах П. ВАСІЛЬЕЎ

ЗА ПРАРЫЎ НА ФАБРЫЦЫ „КІМ" ВЯЛІКУЮ АДКАЗНАСЦЬ НЯСУЦЬ БЮРО ІТС І УСЕ ІНЖЭНЕРНА-ТЭХНІЧНЫЯ РАБОТНІКІ.

Інжэнерна-тэхнічная секцыя пры панчошнай фабрыцы „КІМ" налічвае ў сябе 55 асоб, сярод іх з сярэдняй адукацыяй 15, з вышэйшай 8 і практыкаў 22 чалавека.

Пасля рашэння ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыгуначным транспарце і Данбасе, мы ў галіне перабудовы работы, непасрэднай перакідцы інжэнерна-тэхнічных работнікаў і перанясення работы некаторых аддзелаў у цэхі, па нашай фабрыцы прарабілі наступнае: аддзел рацыяналізацыі, як такавы, пры канторы ліквідавалі, з перадачай яго функцый асобным цэхам, а работніка гэтага аддзела тэхніка МАРУДАВА перакінулі ў фарбарна апратурны цэх. Тэхніка тав. ФРЫДМАНА з БРІЗ таксама перакінулі ў вязальны цэх у якасці брыгадзіра. Неабходна падкрэсліць, што гэтыя таварышы без жадання пайшлі работаць у цэхі, на поўнасьцю ўяўляючы сабе важнасць і адказнасць работы непасрэдна ў цэху.

З 55 членаў ІТС, у канторы зараз работае толькі 6 чалавек, а астатнія знаходзяцца на вытворчасці. Адным з хворых момантаў у рабоце секцыі з'яўляецца тое, што значная частка яе членаў не ўдзельнічаюць у праводзімых грамадскіх мерапрыемствах на фабрыцы, каб вывесці яе з прарыва. Фактам з'яўляецца тое, што члены ІТР не дапамагаюць гаспадарча-разрахунковым брыгадам у распрацоўцы плана брыгады. Вытворчы сектар секцыі, на чале якога стаіць тав. ГЕЛЬФАТ, недастаткова вядзе работу па цэхах.

Секцыя слаба праводзіць работу па ахопе ўсіх рабочых тэхмінімумам.

Секцыя ІТР займалася пытаннямі якасці выпускаемай прадукцыі. На пасяджэнні бюро, на сходзе былі прыняты канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэнні якасці. Напрыклад, праводзіць сістэматычна інструктаж механікаў аб тым, як зменшыць штопку; для большага кантроля ўстанавіць міжцэхавую прыёмку і рад іншых. Правядзенне гэтых мерапрыемстваў у жыццё было даручана тав. ШІМЕНАВУ, ЗАПЦАВУ, ЛЕВІНАЙ і КАШНІКАВУ. Гэтыя таварышы не выканалі ўскладзенай на іх адказнай работы і мерапрыемствы, якія-б дапамаглі вывесці фабрыку з прарыва—засталіся на паперы.

У нашай рабоце мы маем таксама і некаторыя дасягненьні. Усе члены ІТС абслугоўваюць начныя змены, знаходзячыся непасрэдна ў цэхах. Арганізавана таварыства НІТО, якое прыступіла ўжо да распрацоўкі тэхпрамфінплана. Узятыя на сябе абавязкі, па рэалізацыі рабочых прапаноў (электровоз, адводныя краны фарбарных бараж) мы да тэрміна выканалі.

Да ўсебеларускага злёту ўдарнікаў якасці, рабочыя і ІТР фабрыкі «КІМ» пад непасрэдным кіраўніцтвам партактывіста павінны вывесці фабрыку з ганебнага прарыва, даць працоўнаму спажыўцу прадукцыю лепшай якасці. Старшыня бюро ІТС БАС.

АД РЭДАКЦЫІ:

За першае паўгоддзе фабрыкі «КІМ» план выканан на 76,6 проц., за ліпень—88,1, за жнівень—84,4 пр ц. Нізкагатункавая прадукцыя за ліпень складае 32 проц. Гэта кажа аб тым, што работа на фабрыцы перабудавана фармальна. Кіраўніцтва фабрыкі абмежавалася тым, што ліквідавала аддзел БРІЗ. Вялікая доля віны ў прарыве на фабрыцы падае і на бюро ІТС, якое слабара ботала, не прымала рашучых мер да знішчэння тых непаладак, якія перашкаджаюць рабоце фабрыкі.

ГарМБІТ павінен заняцца работай секцыі, дапамагчы ёй выйсці з таго становішча, у якім яна зараз знаходзіцца. Ад бюро ІТС фабрыкі «КІМ» мы чакаем канкрэтных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да гарадскога і ўсебеларускага злётаў якасці, ак тыўнага ўдзелу ў перадкастрычніцкай пераклічцы.

Аб функцыях прафсаюзаў і міжсаюзных органаў у галіне соцыяльнага страхавання.

Пастанова прэзыдыуму УсеЦСПС.

У ажыццяўленне пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 10 верасня прэзыдыум УсеЦСПС устанаўлівае наступныя асноўныя функцыі фабзаўмясцкомаў, аддзелаў і ЦК саюзу, саўпрофаў і УсеЦСПС па страхаванню

1. НА ФАБЗАЎМЯСЦКОМЫ УСКЛАДАЕЦЦА:

а) вызначэнне праў застрахаваных на дапамогу і ўстанаўленне размера дапамогі па часовай непрацаздольнасці, цяжарнасці, кармленню грудзьдзіцяці ў адпаведнасьці з нормамі, устаноўленымі законам і правіламі УсеЦСПС для розных катэгорый рабочых і служачых (ударнік, стаж вытворчы, прафсаюзны, працягласць работы на даным прадпрыемстве), а таксама пазбаўлення права на атрыманне дапамогі летуноў, рвачоў і прагульшчыкаў;

б) кантроль за правільнай выплатай дапамогі прадпрыемствамі і ўстановамі;

в) кантроль за правільным прадстаўленнем адпачынкаў па часовай непрацаздольнасці і барацьбе з сімуляцыяй;

г) набыцьцё і выдача путёвак у санаторыі, на курорты і ў дамы адпачынка;

д) удзел у арганізацыі дыетычнага харчавання і выдача пазыкленняў урачоў дазволаў на карыстанне дыетычным харчаваннем;

е) удзел у арганізацыі і фінансаванні ясляў, дзіцячых садоў і дзіцячых пляцовак і нагляданне ў іх дзяцей застрахаваных;

ж) кантроль за прадстаўленнем інвалідам і часова непрацаздольным больш лёгкай работы у адпаведнасці з заключэннем урачэбна—працоўных экспертных камісій;

з) кантроль і правядзенне мер забяспечваючых своечасовае і поўнае паступленне страхавых узносаў і іх правільнае выдаткаванне;

і) складанне каштарыса выплатнога пункта і прадстаўленне яго на зацвярджэнне ў рэспубліканскі, абласны, краявы аддзел профсаюза, а пры адсутнасці іх—У ЦК саюзу;

к) арганізацыя ўрачэбна працоўных экспертных камісій на буйнейшых прадпрыемствах.

Для вядзення работы па соцыяльнаму страхаванню ў прадпрыемствах і ўстановах складаюцца выплатныя пункты на ўсіх фабзаўмясцкомах.

У раённых аддзелах саюза, дзе няма выплатных пунктаў, складаюцца касы соцыяльнага страхавання на правах выплатных пунктаў фабзаўмясцкомаў.

2. НА РЭСПУБЛІКАНСКІЯ, КРАЯВЫЯ, АБЛАСНЫЯ І РАЁННЫЯ АДДЗЕЛЫ САЮЗАЎ УСКЛАДАЕЦЦА:

а) кіраўніцтва ўсёй работай фабзаўмясцкомаў у галіне соцыяльнага страхавання і кантроль за абслугоўваннем імі застрахаваных;

б) зацвярджэнне каштарыса фабзаўмясцкомаў па соцыяльнаму страхаванню;

в) спагнанне страхавых узносаў;

г) заключэнне дагавораў з адпаведнымі органамі аховы здароўя ў тых выпадках, калі застрахаваныя данай галіны абслугоўваюцца спецыяльнымі больніцамі і лекавымі ўстановамі, і фінансаванне гэтай справы;

д) прызначэнне пенсій па інвалідности, па старасці і за выслугу гадоў і пенсій па выпадку страты кармільца;

Для вядзення работы па соцыяльнаму страхаванню ў рэспубліканскіх, краявых і абласных аддзелах прафсаюзаў стварэюцца касы соцыяльнага страхавання.

3. НА ЦЭНТРАЛЬНЫЯ КАМІТЭТЫ САЮЗАЎ УСКЛАДАЮЦЦА:

а) кіраўніцтва работай рэспубліканскіх, краявых, абласных і раённых аддзелаў саюза і фабзаўмясцкомаў у галіне соцстрахавання і кантроль за правядзеннем гэтай работы;

б) складанне і прадстаўленне на разгляд УсеЦСПС каштарысаў соцыяльнага страхавання;

в) зацвярджэнне каштарысаў па соцыяльнаму страхаванню рэспубліканскіх, краявых, абласных і раённых аддзелаў прафсаюза;

г) выданне дадатковых правілаў і растлумачэнняў па соцыяльнаму страхаванню прыстасоўна да асобых умоў адпаведных галін прамысловасці;

д) капітальнае будаўніцтва і кіраўніцтва санаторыямі і дамамі адпачынка, знаходзячымися ў веданні ЦК прафсаюзаў;

е) кантроль за своечасовым і поўным паступленнем страхавых узносаў у адпаведных галінах прамысловасці;

ж) распрацоўка мерапрыемстваў па барацьбе з захворваемасцю;

з) заключэнне з адпаведнымі органамі аховы здароўя дагавора аб медыцынскім абслугоўванні застрахаваных і фінансаванне меддапамогі у тых выпадках, калі медабслугоўванне пабудавана па галінаваму прынцыпу.

Для вядзення работы па соцыяльнаму страхаванню ў ЦК саюзаў стварэюцца касы соцыяльнага страхавання.

4. НА РАЁННЫЯ І ГАРАДСКІЯ СОВЕТЫ ПРАФСАЮЗАЎ УСКЛАДАЕЦЦА:

а) кантроль і кіраўніцтва работай райаддзелаў і фабзаўмясцкомаў па соцыяльнаму страхаванню;

б) кантроль за своечасовым і поўным паступленнем страхавых узносаў у межах раёна ці горада;

в) заключэнне дадатковых дагавораў з раённымі, гарадскімі органамі аховы здароўя на абслугоўванне меддапамогай застрахаваных і кантроль за выкананнем пастановай гэтай справы;

г) у тых выпадках, калі застрахаваныя не абяднаны раённымі аддзеламі саюзу, гарадскія і раённыя советы прафсаюзаў непасрэдна абслугоўваюць застрахаваных, вызначаючы права на дапамогу і размер дапамогі па часовай непрацаздольнасці і дадатковых відах дапамогі; пры гэтым райсоупрафы вядуць улік прыбытка і выдаткаў галінавым разрэзе;

д) арганізацыя ўрачэбных працоўных экспертных камісій.

5. НА РЭСПУБЛІКАНСКІЯ, КРАЯВЫЯ І АБЛАСНЫЯ СОВЕТЫ ПРАФСАЮЗАЎ УСКЛАДАЕЦЦА:

а) кантроль і кіраўніцтва ва ўмежах рэспублікі, краю ці обласьці работай усіх аддзелаў саюза і райсаупрафа;

б) складанне і прадстаўленне ва УсеЦСПС зводнага каштарыса соцыяльнага страхавання па рэспубліцы, краю ці обласьці; зацвярджэнне каштарысаў раённых і гарадскіх советаў прафсаюзаў па соцыяльнаму страхаванню;

в) заключэнне пры ўдзеле рэспубліканскіх, краявых і абласных аддзелаў прафсаюзаў дагавораў з органамі аховы здароўя на медыцынскае абслугоўванне застрахаваных і фінансаванне гэтай справы;

г) капітальнае будаўніцтва і кіраўніцтва санаторыямі, курортамі і дамамі адпачынка, знаходзячымися ў іх веданні;

д) арганізацыя ўрачэбна-працоўных экспертных камісій;

е) арганізацыя і кіраўніцтва дамамі інвалідаў працы.

6. НА УсеЦСПС УСКЛАДАЕЦЦА:

а) кіраўніцтва і кантроль работай усіх прафсаюзных і міжсаюзных органаў па соцыяльнаму страхаванню;

б) складанне і прадстаўленне на зацвярджэнне СНК СССР зводнага каштарыса соцыяльнага страхавання Саюза ССР, аховліваючага каштарысы ЦК прафсаюзаў, рэспубліканскіх, краявых і абласных советаў прафсаюзаў і каштарыс УсеЦСПС па соцыяльнаму страхаванню;

в) капітальнае будаўніцтва і кіраўніцтва санаторыямі, курортамі, дамамі адпачынка і інстытутамі, якія знаходзяцца ў яго веданні;

г) распрацоўка і прадстаўленне на зацвярджэнне СНК СССР законаў аб соцыяльным страхаванні і тарыфаў страхавых узносаў;

д) выданне інструкцый, правілаў і растлумачэнняў у развіццё законаў аб соцыяльным страхаванні;

е) удзел ва ўсталяванні парадка і размер фінансавання органаў аховы здароўя на абслугоўванне меддапамогай застрахаваных.

Механізмам—поўную нагрузку! Ніводнай мінуты прастоя!

ВІЦЕБСКІ ТРАМВАЙ ПАВІНЕН РАБОТАЦЬ УЗОРНА.

Разам з ростам цяжкай і лёгкай індустрыі, разам з ростам соцыялістычных гарадоў расце і значэнне абслугоўваючых галін гарадской гаспадаркі, аднэй з важнейшых галін якой з'яўляецца трамвай.

Трамвайная гаспадарка Совецкага саюза асабліва вырасла за апошнія некалькі год. Разам з пабудовай новых трамваеў, як-та ў Менску, праводзіцца пашырэнне і рэканструкцыя старых трамвайных гаспадарак, да якіх між іншым адносіцца і наш віцебскі трамвай.

Не гледзячы на вялізарны рост і пашырэнне трамвайнай гаспадаркі, мы ўсё-ж сёньня вымушаны канстатаваць, што наш трамвай ні ўсюды і не заўсёды спраўляецца са сваімі задачамі, ён досыць часта адстае ад дынамікі роста запатрабаванняў шырокіх працоўных мас, асабліва ў буйных соцыялістычных індустрыяльных цэнтрах Совецкага саюза.

Расце культурны ўзровень совецкага працоўнага, растуць і яго запатрабаванні ў механізаваным перасоўванні. Брывая трамвайных перавозак адбівае як у люстэрцы і эканамічны рост таго ці іншага горада. Жывой ілюстрацыяй гэтага палажэння з'яўляецца трамвайная лінія Пролетарская слабада—Віцебск.

На вялікі жаль віцебскі трамвай не можа пахваліцца добра наладжанай, чоткА арганізаванай работай. Расхлябанасць, шматлікія факты парушэння працоўнай дысцыпліны і правіл унутранага распарадку, абязлічка ў скарыстанні вагонаў, дрэнны рух, асабліва па маршруту № 2 (Вагзал-Ленінская), частыя паломкі і інш., —усё гэта з'яўляецца характэрным для работы і дзейнасці віцебскай гарадской чыгункі. Між тым, ёсць усе ўмовы для знішчэння гэтых недахопаў.

У мэтах карэннага паляпшэння работы трамвая, у мэтах выяўлення лепшых вадзіцеляў трамвайных вагонаў—Усесаюзны совет комунальнай гаспадаркі пры ЦВК СССР і ЦК союза комунальнікаў абвясцілі ўсесаюзны конкурс на лепшага вагонаважатага СССР. Парадак конкурса такі, што з 15 ліпеня да 1 кастрычніка правядзяцца гарадскія і раённыя конкурсы, а з 1 кастрычніка па 15 лістапада—усесаюзны конкурс, у якім прымаюць удзел лепшыя ўдарнікі гарадскіх і паркавых конкурсаў. Асноўнымі вымернікамі якасці работы ў час конкурса з'яўляецца прабег вагона ў поўрэйсах, у кілометрах і вагона-гадзінах, і, безумоўна, прымаецца пад увагу і эканамічны прабег—колькасць перавезеных пасажыраў, выручка ў рублях. Адсутнасць па віне вагонаважатага наездаў, сутычак, нашчасных выпадкаў з пасажырамі, адсутнасць аварый, сходу вагонаў з рэек і г. д.—таксама ўваходзіць у ўмовы конкурса і вымярае, наколькі вагонаважаты сумленна адносіцца да вагонаў, правадоў і рэек, як да сацыялістычнай уласнасці, гэта-ж вымярае і ступень тэхнічнай падрыхтаванасці важатага, яго дысцыпліну і адносіны да сваіх абавязкаў і ўрэшце конкурс ставіць і такія ўмовы, як адсутнасць парушэння правіл унутранага распарадку, рацыянальнае скарыстанне электрычнасці, аўладанне тэхнічным мінімумам, унясенне рацыяналізатарскіх прапаноў і актыўная грамадская праца.

Першаму ўсесаюзнаму конкурсу вагонаважатых прысвоена імя другой гадавіны чэрвеньскага пленума ЦК УсеКП(б) (1931 г.), таго самага пленума, на якім стаяла пытанне аб гарадской гаспадарцы Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў СССР. Гэты пленум безумоўна адыграў рашаючую ролю ў развіцці ўсіх галін гарадской гаспадаркі, а значыць і трамвая.

Пачэснае імя, якое носіць конкурс, патрабуе ад яго ўдзельні аў яшчэ больш шчырай работы, яшчэ большай напружанасці ўсіх сіл і энергіі на тое, каб трамвай работаў па большэвіцку.

Для віцебскага трамвая гэты конкурс, акрамя паказаных тут задач, набывае яшчэ асаблівае значэньне.

Віцебскі трамвай на працягу другой пяцігодкі павінен цалкам рэканструяваць усю сваю гаспадарку. Ён ужо ўступіў у 1933 г. у палосу гэтай рэканструкцыі—гатовы і здадзены ў эксплятацыю новая шырокая калея па маршруту № 1 (Плац Волі—Гогалёўская—Вакзальная). Па гэтаму новаму шляху ўжо ходзіць новы вагон. Усесаюзны конкурс павінен з'явіцца для работнікаў віцебскага трамвая экзаменам таго, як яны будуць работаць на новым рэканструяваным шляху, на новых тэхнічна-высока абсталяваных вагонах.

Гэты конкурс павінен, акрамя таго, дапамагчы работнікам трамваю асвоіць усе тыя сродкі, якія адпушчаны на рэканструкцыю гаспадаркі, на будаўніцтва, асвоіць гэта будаўніцтва ў вызначаны тэрмін.

У выніку

УСЕБЕЛАРУСКІ ДЭКАДНІК СОЦСПАБОРНІЦТВА ПА ФІНПЛА

Сустрэнем раенны злет фінударнікаў поўным выкананнем плана 3 квартала

ГАЛОЎНЫ УПОР—НА РЭАЛІЗАЦЫЮ І ЗБОР УЗНОСАЎ ПА ПАЗЫЦЫ, УЦЯГНЕННЕ ЎКЛАДАЎ У АШЧАДКАСЫ, ПАЯНАКАПЛЕННЕ Ў ЖЫЛКААПЕРАЦЫІ, СПАГНАННЕ АБАВЯЗКОВЫХ ПЛАЦЯЖОЎ НА ВЁСЦЫ.

АБ ХОДЗЕ ВЫКАНАННЯ ФІНАНСАВАГА ПЛАНА ТРЭЦЯГА КВАРТАЛА.

Пастанова Віцебскага гарсовета ад 13 верасня 1933 г.

Заслухаўшы інфармацыйнае паведамленне загадчыка гарфа т. Ордынцава аб ходзе выканання плана мабілізацыі сродкаў трэцяга квартала, гарсовет канстатуе:

1. На 10 верасня план мабілізацыі сродкаў трэцяга квартала па гораду і раёну выкананы толькі на 68,5 проц.

2. Вызначаны тэрмін стопроцантага выканання фінплана паводле соцдагавора канчаецца, а сучасныя тэмпы мабілізацыі сродкаў ставяць под яўную пагрозу зрыва выкананне прынятых на дагавору абавязацельстваў. Гэта тлумачыцца поўнай безадказнасцю з боку кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў у выкананні фінплана, неўнясеннем узносаў па падпісцы на пазыку за верасень у суме 500 тыс. р., невыкананнем плана паенакаплення па жылкааперацыі ў суме 74 тыс. р., і рэйсюзам 34 тыс. руб., а таксама зусім дрэнным паступленнем вясковых абавязковых плацяжоў, асабліва страхоўкі (недапаступіла 200 тыс. р.) і ўзносаў па падпісцы на пазыку сярод калгаснікаў (недапаступіла 100 тыс. р.) рэалізацыя пазыкі за наяўны рахунак па аднаасобнаму сектару не мае ніякага зрыва.

З боку кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў, а таксама сельскіх саветаў не разгорнута належная масавая работа сярод рабочых, калгаснікаў і прапоўных аднаасобнікаў, а таксама не мабілізаван актыў на датэрміновае выкананне фінплана і побач з гэтым адсутнічае рашучы націск на кулацка заможную частку вёскі ў сэнсе спагнання з яе абавязковых плацяжоў.

Выходзячы з гэтага, гарсовет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прапанаваць усім кіраўнікам прадпрыемстваў і ўстаноў у трохдзённы тэрмін унесці як запазычанасць, так і чарговыя ўзносы за верасень па падпісцы на пазыку.

2. Пад адказнасць праўлення гаржылсаюза, жактаў, праўленняў райсаюза і сельспажыўгаварыстваў у пяцідзённы тэрмін поўнасцю выканаць план паенакаплення.

3. Пад асабістую адказнасць старшынь сельсаветаў у трохдзённы тэрмін шляхам рашучага націску на кулака і заможніка і масавай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў забяспечыць поўную выплату абавязковых плацяжоў, а асабліва страхоўкі.

4. Кіраўнікам ашчадкас, устаноў і прадпрыемстваў, а таксама старшыням сельсаветаў зараз-жа разгарнуць масавую работу па ахопу падпіскай на пазыку ўсіх рабочых, калгаснікаў і рэалізацыі пазыкі за наяўны разлік па аднаасобнаму сектару.

Дабіцца ахопа ўкладамі ў ашчадкасу і калектыўным страхаванні жыцця не менш 75 проц. рабочых і калгаснікаў.

5. На 21 верасня склікаць злёт ударнікаў фінфронта ўсяго раёна.

21 верасня—агульнараённы злёт фінударнікаў.

21 верасня праводзіцца агульнараённы злёт ударнікаў фінфронта па пытаннях падгатоўкі выніку за работы за датэрміновае выкананне фінансавага плана мы маем значны зрух уперад. Калектыўным страхаваннем і ўкладам у ашчадную касу на сённешні дзень ахоплена 75 проц. агульнай колькасці рабочых. Якім чынам мы гэтага дабіліся?

Пасьля нарады рэдактараў шматты ражак у рэдакцыі газеты „Віцебскі пролетарый", на фабрыцы быў склікан злёт фінударнікаў, рабкораў і рэдактараў насценных газет. На гэтым злёце да кожнай групы, брыгады прымацавалі рабкораў і фінакцывістаў для правядзення шырокай масавай растлумачальнай работы сярод рабочых аб важнасці выканання фінансавага плана.

Першым застрэльшчыкам у правядзе ні калектыўнага страхавання з'явілася брыгада Гуткінай, якая раней усіх правяла страхаванне сярод сваіх рабочых і выклікала на спаборніцтва швейны цэх. На выклік, швейны цэх адказаў поўным ахопам сваіх рабочых калектыўным страхаваннем. Пасля гэтага, разгарнулі работу па калектыўнаму страхаванню і ўкладах у ашчадкасу ўсе цэхі. Разгарнулася спаборніцтва паміж цэхамі на лепшае правядзенне работы па датэрміновану выкананню фінплана.

Замацаваць першыя посьпехі, змагацца за канчатковую перамогу.

За апошні час па фабрыцы імя КЛАРЫ ЦЭТКІН у справе выканання фінансавага плана мы маем значны зрух уперад. Калектыўным страхаваннем і ўкладам у ашчадную касу на сённешні дзень ахоплена 75 проц. агульнай колькасці рабочых. Якім чынам мы гэтага дабіліся?

Пасьля нарады рэдактараў шматты ражак у рэдакцыі газеты „Віцебскі пролетарый", на фабрыцы быў склікан злёт фінударнікаў, рабкораў і рэдактараў насценных газет. На гэтым злёце да кожнай групы, брыгады прымацавалі рабкораў і фінакцывістаў для правядзення шырокай масавай растлумачальнай работы сярод рабочых аб важнасці выканання фінансавага плана.

Першым застрэльшчыкам у правядзе ні калектыўнага страхавання з'явілася брыгада Гуткінай, якая раней усіх правяла страхаванне сярод сваіх рабочых і выклікала на спаборніцтва швейны цэх. На выклік, швейны цэх адказаў поўным ахопам сваіх рабочых калектыўным страхаваннем. Пасля гэтага, разгарнулі работу па калектыўнаму страхаванню і ўкладах у ашчадкасу ўсе цэхі. Разгарнулася спаборніцтва паміж цэхамі на лепшае правядзенне работы па датэрміновану выкананню фінплана.

Зараз на фабрыцы няма НІВОДНАГА РАБОЧАГА, ЯКІ-Б НЕ БЫЎ ТРЫМА ЦЕЛЕМ ПАЗЫКІ ПЕРШАГА ГОДА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ. КВАРТАЛЬНАЕ ЗАДАННЕ ПА ЎКЛАДАХ ПЕРАВЫКАНАНА.

Але усё ж гэта недастаткова. Фабрыка мае ўсе магчымасці для стопроцантага ахопа рабочых калектыўным страхаваннем і ўкладамі ў ашчадкасу, але гэтыя магчымасці да гэтага часа слаба выкарыстаны.

Трэба адзначыць, што фабрыка не выканала яшчэ сваёй абавязацельства, узятае на прафсаюзна-фінансавым дні аб пасылцы буксірнай брыгады на фабрыку «КІМ».

Наша задача, задача ўсёй прапоўнай грамадскасці замацаваць дасягнутыя поспехі і змагацца за канчатковую перамогу, за моцнае трыманне пераходнага чырвонага сцяга, які мы атрымалі за ўзорную пастаноўку работы па рэалізацыі пазыкі.

Калектыўны карэспандэнт рэдакцыі «Віцебскі пролетарый» —ШМАТТЫРАЖКА „ПАНЧОШНІЦА".

Калгасная грамадскасць яшчэ не мабілізавана.

Па Сенюцкаму сельсавету на 10 верасня маецца недаімшчыкаў па сельгаспадатку 169 гаспадарак, страхоўцы—315, самаабкладанні — 215. Сельсавет заключыў соцыялістычны дагавор на датэрміновае выкананне фінплана 3 квартала з Рудзіцкім сельсаветам, але трэба падкрэсліць, што на справу барацьбы за датэрміновае выкананне фінансавага плана не мабілізавана ўся грамадскасць.

Рад членаў сельсавета літэральна безадказна не арганізуе аднаасобнікаў на сваіх пунктах на датэрміновае выкананне фінплана. Да гэтых членаў сельсавета адносяцца: Красаўцоў Іван, Жбанаў Васіль і інш. Старшыні калгасаў (імя Чарвякова, «Чырвоны чыгуначнік», «1 мая») не ўносяць грошы па абавязковых плацяжах і грошы за пазыку.

У сельсавеце ёсць сапраўдныя змагары за выкананне фінансавага плана. Да гэтых ударнікаў адносяцца: Рыжкоў, Гурэвіч, Пескін, Скабленка, Антонаў і настаўнік Новікаў, яны на сваіх пунктах да 10 верасня выканалі план спагнання абавязковых плацяжоў на 100 проц., а таксама ўзяліся за рэалізацыю пазыкі за наяўны разлік сярод аднаасобнікаў. Па гэтых ударніках кожны член сельсавета, актывіст павінен раўняцца.

ЭПШТЭЙН.

НЕАДКЛАДНА ЛІКВІДАВАЦЬ ГАНЕБНАЕ АДСТАВАННЕ Ў ВЫКАНАННІ ФІНПЛАНА.

Калі праводзілася падпіска на пазыку „Першага года другой пяцігодкі", фабрыка «ДЗВІНА» з некаторым адставаннем планавае задание ўсё ж такі выканала. Але замацаваць свае дасягненні фабрычныя арганізацыі не змаглі, вельмі хутка дэмабілізаваліся і далейшую работу пусцілі на самацёк.

На працягу трох месяцаў з фабрыкі звольнілася 842 чалавека, прынята зноў 196. Да самага апошняга часа ні парткалектыў, ні фабком ні камсод нічога не зрабілі, каб правесці сярод новых рабочых падпіску на пазыку. Урэшце, за гэту справу ўзялася ашчадкаса, і вынікі даюць сабе адчуваць. На сённешні дзень ахоплена падпіскай 120 чалавек на суму 6310 руб., астатнія 76 чалавек таксама гатымі грамі будуць ахоплены.

Выходзіць, як быццам на фабрыцы становішча палепшылася. Але ж, гэта далёка не так. Спр ва ў тым, што на сённешні дзень па прыблізнаму падліку на фабрыцы маецца 350 рабочых, з якіх НЕ УТРЫМЛІВАЮЦЦА АДЛІЧЭННІ НА ПАЗЫКУ. Вінаваты ў гэтым цэхавыя канторы, якія пры перадводзе рабочых з цэха ў цэх ніякіх адлічэнняў не вытвараюць нават і тады, калі самі рабочыя ім аб гэтым нагадваюць. Быў такі факт: работніцы мотальнага цэха, якія ўвесь час працуюць у гэтым цэху, але чамусці адлічэнняў на пазыку з іх не ўтрымліваліся, звярнуліся да цэхавой канторы за тлумачэннем, чаму гэта так. У канторы ім адказалі: «У наступным месяцы зробім утрыманне (таб. № 1570 тав. Капышнікава і № 1523 тав. Вінніка).

Гэта з'явішча гаворыць аб бюракратычных адносінах працаўнікоў цэха вых кантор з аднаго боку, і з другога—аб блядзейнасці камсода. Але паміж іншым, за сваю «добрую» працу быў распушчан у канцы жніўня. Камсоду прадстаіць валіцца, каб ліквідаваць прарыў у работу, а па падпісцы на пазыку і спагнанню ўзносаў.

Але новы камсод не хоча брацца за работу. Старшыня камсода т. МАЕЎ (член партыі) ужо падаў заяву фабкому з просьбай аслабаніць яго ад гэтай працы, паколькі ён ПТР і «як аднэй нагрузкі несці не можа, зумела што пры такіх умовах доработы нельга чакаць.

Дрэнна ідзе работа па фабрыцы галіне страхавання рабочых. Ахоп страхаваннем толькі 11 проц. і ўзнякія патрэбна было ўносіць кожны месяц, ашчадкаса атрымала тэ адзін раз, а цэхавыя канторы на не ведаюць з каго трэба ўтрымліць.

Не лепш і з уцягненнем укладаў у ашчадкасу, якая не перабула сваёй работы, не вядзе сярод чых шырокай масава-растлумачальнай працы аб задачах і значэнні агульнай справы.

Да раённага злёта ўдарнікаў фронта засталося мала часу. Фабрыка «Дзвіна» павінна ліквідаваць сваё ганебнае адставанне ў выкананні плана шляхам разгортвання соцсаб ніцтва, 100-процантага ахопа рабочых падпіскай на пазыку, уцягнення у ашчадкасу, пашырэннем страхання рабочых і г. д.

Неадкладна трэба ліквідаваць насці са спагнаннем узносаў па пазыцы, прыцягнуўшы вінаватых у спагнанні ўзносаў да суровай адказнасці.

КІРЫЛА

УСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁПЕРАКЛІЧКА ПА ФІНПЛАНУ.

13 верасня адбылася Ўсебеларуская радыёперакліччка па датэрміновому выкананню фінплана 3 квартала. У гэтай перакліччы ўдзельнічаў і Віцебск.

Віцебск значна адстаў ад іншых раёнаў Беларусі ў выкананні фінансавага плана і займае 46 месца. II раёнаў на 10 верасня поўнасцю завяршылі квартальны план мабілізацыі сродкаў.

Уся пролетарская грамадскасць Віцебшчыны павінна напружыць усе свае сілы для таго, каб у самы бліжэйшы час дабіцца поўнага выканання фінансавага плана па ўсіх 6 пунктах усесаюзнага дагавора аб соцспаборніцтве па фінплану.

Ёсць толькі зрух, дабівацца неадкладнага і поўнага выканання плана.

За апошнія дні дэкадніка соцспаборніцтва, дзякуючы разгорнутай палітыка—масавай работе ў цэхах, друкарня «Камінтэрн» дамаглася таго, што 19 чалавек рабочых дадаткова ахоплена падпіскай на пазыку, 126—калектыўным страхаваннем, 40—укладчыкамі ў ашчадкасу. Пры бухгалтэрыі арганізавана агенцтва ашчадкасы.

14 верасня праведзен злёт фінударнікаў па пытанні далейшай барацьбы за датэрміновае выкананне фінансавага плана.

БЕСК

Напярэдадні працэса аб падпале рейхстага.

Міжнародны грамадскі суд над сапраўднымі падпальшчыкамі рэйхстага.

ЛОНДОН, 14. Сёння адкрылася сесія міжнароднага грамадскага суда, разглядаючага справу аб падпале рэйхстага. Сярод прысутных—ЛЕНСБЕРЫ, ГЕРБЕРТ УЭЛЬС, прафесар ЛАСКІ і інш. Многа журналістаў. Прысутнічаюць таксама некалькі прадстаўнікоў нацыянал - соцыялісцкага друку.

Адкрываючы пасяджэнне, ангельскі адвакат КРЫПС звярнуўся да фотографаў з просьбай не знімаць сведак. „Гэта не пажадана,—заявіў ён,—паколькі ў многіх частках Эўропы існуюць ненармальныя ўмовы" Ва ўступнай прамове лейбарыст Крыпс заявіў, што падпал рэйхстага вравіў сенсацыю ва ўсім свеце, бо адбыўся ў момант, спрыяючы для нацыянал-соцыялістаў, прышоўшых тады да ўлады ў Германіі. Потым ён звярнуў увагу на ўзмоцненую прапаганду на карысць асуджэння абвінавачваемых комуністаў у Германіі і прывёў у якасці прыклада надаўняе выступленне адной германскай газеты, патрабаваўшай кары смерцю для ўсякага, хто адважыцца выступіць у якасці сведкі абароны. Крыпс адзначыў няўдачу спроб забяспечыць абарону для абвінавачваемых, у прыватнасці адмову лейпцыгскага суда дапусціць чужаземных абаронцаў, хаця гэта дазваляецца германскім законам.

Крыпс прывёў спісак прысутных юрыстаў: Бакернорт (Галандыя), БЕРЖЭРЫ (Францыя), БРАНЦІНГ(Швецыя), ГАРФІЛЬД ГЕЙС (ПАЗШ), ВАЛЬДГЮГ (Данія), ФРЫД (Англія), ВЕРМЕЙЛС (Бельгія). Крыпс паведаміў таксама, што чакаецца прызначэнне лейпцыгскім судом афіцыйны абаронца Торглера адвакат САК. Сакратар суда паведаміў, што пасяджэнні будуць адбывацца штодзённа аж да 18 верасня. Маркуецца сфармуляваць канчаткова вывады 19-га з тым, каб паспець пасланць сваё заключэнне ў лейпцыгскі суд да пачатка працэса. На абвестцы дня: 1) Абгрунтаванне афіцыйных паведамленняў адзела друку прускага ўрада аб падпале; 2) агалошанне тэлеграм карэспандэнтаў ангельскага друку аб пажары і г. д. Сакратар прыступае да чытання паведамленняў нацыянал—соцыялісцкага ўраду і тэлеграм карэспандэнтаў, якія з самага пачатку іранічна адгукаліся аб абвінавачваннях, высунутых нацыянал-соцыялістамі, і намякалі на чуткі аб тым, што падпальшчыкамі з'яўляюцца нацыянал соцыялісты.

Першай сведкай выступае ГЕРЦ, соцыял-дэмакрат, дэпутат рэйхстага з 1920 г., кіраўнік сакратар'ята соцыял-дэмакратычнай фракцыі з 1922 г. Ёй апісаў устройства будынкаў рэйхстага і размяшчэнне выхадаў. З яго слоў сведыць, што: 1) усе знешнія ўваходы ў рэйхстаг пільна ахоўваліся як у часе пасяджэнняў, так і ў другі час; 2) апрача гэтых выхадаў, маецца яшчэ толькі адзін ход, які праходзіць пад зямлёй і злучаецца з домам прускага прэм'ера. Праз гэты ход праходзяць трубы ацяплення і правады; 3) дэпутаты ніколі не карысталіся гэтым ходам; 4) следуе дапусціць, што гэтым ходам можна карыстацца, паколькі там работалі рабочыя па рамонту труб.

БЕСПРАЦОЎЕ Ў АМЕРЫЦЫ.

Улічная сцэна ў Нью Іорку. На першым плане—чалавек з прыкалотым на спіне плакатам: «Вазму усякую работу. Што вы можаце мне прапанаваць?

НЕ ВЫГАРАЕ..

БЕРЛІН, 14. Нацыянал соцыялісты разлічваюць, што ім удасца на аснове змешчаных у кнізе Эрта „матэрыялаў" аб «збройным паўстанні», падрыхтаваным нібыта германскай компартыяй, пераканаць рэакцыйныя колы ўсіх краін у „пістарычнай місіі германскага нацыянал-соцыялізма" у барацьбе супроць «комуністычнай небяспекі». Аднак надзеі не апраўдаліся. Гэта вымушана прызнаць «Бэрлінер берзенцэйтунг», канстатуючы, што „сусветны друк маўчыць аб выкрыцці, зробленым у кнізе Эрта". З гэтага правала газета робіць вывад, што не абходзе мабілізаваць „усіх германскіх грамадзян" маючых якія-небудзь сувязі з заграніцай, для пашырэння за граніцай «праўды» аб становішчы ў Германіі».

Новыя бязглуздныя абвінавачванні супроць компартыі.

БЕРЛІН, 14. Адначасова з апублікаваннем брашуры Эрта, мэта якой «даказаць» прычаснасць германскай компартыі да падпала рэйхстага, друк змяшчае паліцэйскае паведамленне, змяшчаючае столь-жа бязглуздныя абвінавачванні супроць компартыі. У паведамленні гаворыцца, што паліцыі нібы ўдалося раскрыць віноўнікаў забойства двух паліцэйскіх афіцэраў, зробленага 9 жніўня 1931 г. і што вядзецца следства супроць 21 комуніста, якія абвінавачваюцца ў гэтым забойстве. Забойствам афіцэраў нібыта «кіравалі» комуністычныя дэпутаты рэйхстага Біпенбергер і Гейнц Нейман.

Паліцыя паведамляе далей, што вышукі віноўнікаў забойства працягваюцца. Сярод адшукваемых прыводзяцца 11 прозвішчаў, у тым ліку Сістэнбергер, Дейч, Эльман, Ульбрыхт, Мінке, Цымер. За ўказанні, якія могуць прывесці да арышту вышукваемых, паліцыя прызначыла ўзнагароду ў 4.000 марак.

Нацыянал-бандыты падстракаюць.

ЛОНДОН, 14. Паводле паведамлення „Дэйлі Геральд", у нацыянал-соцыялісцкім клубе ў Лондоне маецца альбом, які змяшчае ў сябе фотаграфіі 33 відных германскіх эмігрантаў з надпісам: „Калі вы сустрэнеце кагонебудзь з іх—забейце яго, а калі ён жывы—пераламайце яму ўсе косці". Сярод фотаграфій знаходзяцца здымкі асоб, выступаючых сведкамі ў грамадскім судзе, які разглядае справу аб падпале рэйхстага.

„Зберажэнні" па метаду Гебельса.

БЕРЛІН, 14. У прадбачанні цяжкай зімы міністр прапаганды ГЕБЕЛЬС рэкамендуе кожнаму ў першую нядзелю кожнага месяца абмежавацца адным блюдам у 50 пфенінгаў, а атрымліваемыя ад гэтага „зберажэнні" здаваць у агульную касу для дапамогі галадаючым. Акрача таго, у дапамогу галадаючым будуць арганізаваны ўзбраючыя зборы. Гэтыя меры ГЕБЕЛЬС ахарактарызаваў, як „грандыёзнае соцыяльнае мерапрыемства".

Эрыо аб сваім прабыванні ў СССР

ПАРЫЖ, 14. Эрыо прыбыў у Ліон. Адзначыўшы аказаны яму ў СССР вельмі добры прыём, Эрыо заявіў: «Я канстатаваў у СССР ліквідаванае імкненне аўладаць ведамі. Гэта важны момант, тлумачачы бліскучыя дасягненні краіны ва ўсіх галінах, і, асабліва ў асвеце і гаспадарчым развіцці». Спыняючыся на наведванні Днепрадзеса і рада совецкіх гарадоў, Эрыо падкрэсліў вялікія дасягненні совецкай камунальнай гаспадаркі. У прыватнасці Харкаў,—заявіў ён,—з'яўляецца ў гэтых адносінах узорным горадам. На пытанне аб харчовых цяжкасцях у СССР, Эрыо адказаў: «Неабходна сцерагчыся паспешных вываду. Я бачыў жанчын, стаячых у чарзе за атрыманнем газы. Калі я запытаўся, як гэта узгадзіць з велізарнай вытворчасцю нафты ў СССР, мне адказалі, што ў звязку з вялікай колькасцю трактараў, зна ная частка нафты выдаткоўвае ца трактарамі».

Пераходзячы да сваіх уражанняў аб Украіне, Эрыо сказаў, што ён напамі нае яму дэпартамент ВО (адна з самых багатых хлебных правінцый у Францыі). Абвергаючы паклёпніцкія вымыслы буржуазнага друку аб «жабрацтве на Украіне», Эрыо заявіў, што ён ўсюды на Украіне сустракаў працавітае насельніцтва.

Падводзячы вынікі сваім уражанням, Эрыо сказаў: «Калі спакойна і аб'ектыўна сачыць за развіццём СССР, то можна заўважыць, што ен ідзе да таго, каб стаць такой-жа эканамічна-матуг най краінай, як ПАЗШ». У заключэнне Эрыо падкрэсліў, што сардэчны прыём, аказаны яму ў СССР, „выражае сяброўскія пачуцці гэтай краіны да Францыі.

ПАРЫЖ, 14. Увесь французкі друк змяшчае цалкам ці ў падрабязных вынятках заявы Эрыо аб яго паездцы у СССР.

Паводле паведамлення «ПЦІ ПАРЫЗ ЕН», Эрыо заявіў: «Гэта паездка, якая мне даставіла найбольшую радасць у маім жыцці, прадаставіла мне выпадак для добрай работы і сама па сабе была першай узнагародай за маю работу, бо яна была прадпрынята для дабра Францыі і міра. Цяпер самае карысное будзе пераканаць грамадскасць у тым, што па мойму можна і трэба зрабіць для нашых сябраў у СССР». „Цяпер пасля таго, як мы ўсачылі, што хацелі,—заявіў далей Эрыо,—я канстатую, што гэты народ дабіўся вязвычайных дасягненняў». «Я канстатую,—сказаў у заключэнне Эрыо,—што рускія праяўляюць выключны інтарэс да ўсіх галін працы, будзь то ў медыцыне, будзь гэта ў прамысловасці».

Французкі міністр авіацыі прыляцеў у СССР.

КІЕЎ, 13. Сёння прыляцела французкая эскадрылля ў складзе трох самалётаў на чале з міністрам авіацыі Францыі п. ПЁРАМ КОТ.

ХАРКАЎ, 14. Пан Кот са сваімі спадарожнікамі прыляцеў у Харкаў.

ЯПОНСКІ ДРУК АБ ПАЛЁТЕ п КОТА.

ТОКІО, 13. Усе газеты без каментарыяў публікуюць паведамленні «ГАВАС» аб вылеце з Парыжа ў СССР міністра авіацыі П'ера Кот «Гавас». між іншым, піша, што палёт Кота сведчыць аб збліжэнні паміж СССР і Францыяй, прычым, указвае агенцтва, «лічаць, што збліжэнне паміж СССР і Францыяй стварае больш мірную, чым дагэтуль, атмасферу ва ўсходняй Эўропе, улічваючы саюзныя адносіны Францыі да Малай Антанты».

Сёння, 16-га верасня склікаюцца

куставыя нарады рэдкалегій шматтыражак, штодзенак і насценгазет

ПА ПЫТАННІ АБ УДЗЕЛЕ ДРУКА Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЛЁТА ЎДАРНІКАЎ ЯКАСЦІ І Ў ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЙ ПЕРАКЛІЧЦЫ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ.

ПЕРШЫ КУСТ, куды ўваходзяць наступныя прадпрыемствы; фабрыка «Дзвіна», „КІМ", "Белуціль", алейны завод, лесазавод імя «Правды», (№ 13), завод стандартных дамоў, фабрыка гнутай меблі, фанерны завод. Збор у клюбе лесазавода імя «Правды» а 4 гадзіне 30 мінут.

ДРУГІ КУСТ, куды ўваходзяць наступныя прадпрыемствы: «Чырвоны металіст», фабрыка імя Лекерта, „Профінтэрн", „Комінтэрн", акулярная, махорачная, піўзавод, дрожджазавод, спіртзавод, хлебазавод. Збор у стадовай завода «Чырвоны металіст» на Канатнай вуліцы, новы будынак супроць завода, ў 4 гадзіны 30 мінут.

ТРЭЦІ КУСТ, куды ўваходзяць: «Сцяг індустрыялізацыі», шчаціна-шчотачны камбінат, голкавая, фабрыка імя Клары Цеткін, інструментальна-меблёвая, скуразавод, усе цагельныя заводы, трамвай. Збор у памяшканні рэдакцыі „Віцебскі пролетарый", плац Волі, Палац працы, 3-ці паверх, пакой 42, ў 6 гадзін ўвечары.

Яўка ўсіх рэдактараў і членаў рэдкалегій абавязкова.

РЭДАКЦЫЯ „ВІЦЕБСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯ".

Даводзіцца да ведама тт., якія за поўнілі анкеты і маючых камандыроўкі партячэк у агульнагарадскую 8 месячную вячэрнюю СПШ без адрыву ад вытворчасці, што **прыймовая камісія работае з 15 верасня** ад 6 гадзін вечара, ў памяшканні культпропа ГК КП(б)Б.

Пачатак заняткаў—1 кастрычніка, а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканні дзённай СПШ імя Молатава.

Культпроп ГК КП(б)Б.

ПАВЕДАМЛЕННІ.

Сёння, 16 верасьня, а 6 гадзінах вечары, у клубе металістаў адбудзецца ГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ ПА ПЫТАННЯХ АДУКАЦЫІ ІБЯГУЧАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА.

Мандаты атрымаць у гаркоме ЛКСМ.

Выклікаюцца на пасяджэнні партройні гарКК КП(б) 17 верасня, а 6 гадзіне вечары наступныя тт.

Васільева Е. З.—медтэхнікум, Наўў М. Л., Наркунас С. А., Зайкі І. С.—лесазавод № 13, Долінін, Ліна—УВСР 98, Малядоўская Л. Т.—каргас імя Чарвякова, Савіцкі І. Шайкін Я. П.—фанерны завод, Іо—сампрамсаюз, Ур'еў Л. П.—фабрыка імя Лекерта, Раскіна, Кунціна—фабрыка імя К. Цеткін, Рачкоў У. В., Куноў Ф. С., Каган А. М., Коржанеў, Гутаровіч, Тітоў Е. Ш, Эхвольдком цягі МВБ, Темкін П. Р. —спажыўсаюз, Бесарабскі Ф. А.—„Чырвоны металіст", Іучэнка Ф.Д.—Белбудбанк, Басданаў—Даўжанскі сельсавет, Абрам С. І.—ТСТ, Партноў П. П., Федтадор, Белоў—калгас „Труженік", Раселаскага сельсовета, Ліскіпкодавінзавод, Гондарава—Клагінскі совет, Федчанка П. А.—Белдзарэмбанк, Ахраменко—ЗРК, Казлоў А. Ф.—міліцыя, Норатаў П. Ф.—дрожджазавод, Безпрызвольны Г. Д.—каапрамонтаноў С. І—спіртзавод, Радзонаў—оплаўкантора, Колагаў,—Замасковскі сельсовет, Зільберг—фабрыка «Профінтэрн», Нікалаеў А. Н.—калгас „Звязда", Басліна Ш. Л.—фабрыка „КІМ", Вішенгоф—Торгсін, Крукава Ф. М.—вуціль, Можэнеко—пабудова мастка.

Таксама павінны з'явіцца сакратыя ячэек і калектываў, адкуль шэйпаказаныя таварышы выклікаю

Культпроп ГК КП(б)Б паведамляе, што сёння, а 7 гадзіне ўвечары ў Доме камасветы адбудуцца ЗАНЯТКІ ПРАПАГАНДЫСЦКАГА СЕМІНАРА, якія павінны з'явіцца рабочыя-пропагандысты кандыдацкіх школ.

КУЛЬТПРОП ГК КП(б)

Віцебскай базе Саюзшвэйбыт
ПАТРАБУЕЦЦА
старшы бухгальтар
разліковай групы, ТАКСАМА І ГАЛЬТАРЫ І РАХУНКАВОДЫ.
Зварочвацца ад 9 да 5 гадзін у кантору базы (памяшканне прыгрыцы «Сцяг індустрыялізацыі»)
864-3-1

ДРУКАРНІ „КАМІНТЭРН"
патрэбуюцца для навучання ў
на высокакваліфікаванага наборшчыкаў і разборшчыкаў
ад 18 год, з адукацыяй 6—7 гр.
Зварочвацца Большавіцкая
ДЫРЭКЦЫЯ.

УСЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ І УСТАНОВЫ,

якія заключаюць хартаваннем ад Віцебскага цэнтраокаапа для дачы залогі у наркамонаб на грамадскае хартаванне на IV КВАРТАЛ 1933 г., павінны ПРАДСТАВІЦЬ НЕ ПАЗНЕЙ 20 ВЕРАСНЯ У СЕКТАР ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ ВЦЕК, (Вагзальная вул. № 29/23, 3 паверх, пакой № 5) НАСТУПНЫЯ ЗВЕСТКІ: 1) Назва прадпрыемства, 2) адрас, 3) колькасць рабочых у сучасны момант, у тым ліку сезонікаў, 4) сярэдняя колькасць рабочых на IV квартал па прамфінплану (па кожнай змене паасобку), у тым ліку і сезонікаў, 5) на якім спісу знаходзяцца рабочыя прадпрыемствы (паказаць колькасць рабочых па кожным спісу), 6) колькасць вучняў ФЗУ прадпрыемства.

Будаўнічыя арганізацыі, акрамя гэтага, абавязкова павінны паказаць: а) колькасць рабочых на кожным будаўнічым участку, б) да ведку тыпуальнага спіса аб запяразданні будаўніцтва урадавымі органамі і якімі іменна, і месца знаходжання ўчастка.

Усім навучальным установам (інстытутам, тэхнікумам, рабфакам і курсам) таксама прадставіць гэтыя звесткі, прычым курсам паказаць іх тэрмін.

Інспектарыяту асветы прадставіць спіс школ з паказаннем колькасці вучняў і адрасоў школ.

Усе гэтыя звесткі павінны быць ДАКЛАДНА ПРАВЕРАНЫ і абавязкова заверджаны трывутнікамі прадпрыемстваў.

НЕПРАДСТАЎЛЕННЕ гэтых звестак у вызначаны тэрмін, ПАЗБАВІЦЬ МАГЧЫМАСЦІ задаволіць грамадскім харчаваннем ТЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, АД ЯКІХ ЗВЕСТКІ НЕ ПАСТУПЯЦЬ.

Пасля паказанага тэрміна ніякія заяўкі прымацца не будуць.

Звесткі абавязкова прадставіць у двух экземплярах.

ГАРСОВЕТ, ГАРПРАФСОВЕТ, ЦЭРАБКААПЭРАТЫЎ.

870-2-1

Мясцком ахматмедпункта № 2 саюза медсанпрацы і супрацоўнікі ясляў імя Х годдзя БССР пры фабрыцы «Профінтэрн» з глыбокім жалем паведамляюць аб смерці члена саюза і ударніцы, любімага таварыша

ПУШКАРСКАЙ МАРФЫ ІСАЕЎНЫ.

Вынас цела сёння 16 верасня, а 5 гадзіне ўвечары з яе кватэры па Авіацыйнай, № 16.

Гарліт № 12. Друкарня „Камінтэрн" Большавіцкая 10. Нам. адк. рэдактара У. М. ВЕРЖБАЛОВІЧ